А. М. ЗМУШКО

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

Частка 1



5

А. М. Змушко

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

**Вучэбны дапаможнік для 5 класа**
**першага аддзялення дапаможнай школы**
**з рускай мовай навучання**

**У дзвюх частках**
**Частка 1**

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2021

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

УДК 811.161.3(075.3)
ББК 81.411.3я72
З-69

Рэцэнзенты:
кафедра беларускага і рускага мовазнаўства
факультэта пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(дацэнт кафедры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт *А. Г. Міхалевіч*);
настаўнік беларускай мовы вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай
установы адукацыі «Дапаможная школа г. Магілёва» *І. Г. Баранава*

## Умоўныя абазначэнні

— Мы слухаем.

— Мы чытаем.

— Мы размаўляем.

— Мы пішам.

— Тлумачэнне слоў.

— Вымаўляйце правільна.

?! — Адкажыце на пытанні і выканайце заданні.

**Змушко, А. М.**
З-69 Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. 1-га аддз-ня дапам. шк. з рус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 1 / А. М. Змушко. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2021. — 132 с. : іл.
ISBN 978-985-553-722-0.

**УДК 811.161.3(075.3)**
**ББК 81.411.3я72**

**ISBN 978-985-553-722-0**

© Змушко А. М., 2021
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2021

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# Наша мова

**1.** Паслухайце тэкст.

*Дарагія сябры!*

Сёння вы пачынаеце вывучаць новы вучэбны прадмет — беларускую мову. Вы будзеце вучыцца слухаць беларускае маўленне і размаўляць па-беларуску. Вы будзеце слухаць і чытаць творы на беларускай мове, навучыцеся самі пісаць беларускія літары, словы, сказы.

Беларуская мова падобная да рускай, але ў многім адрозніваецца ад яе. Каб авалодаць беларускай мовай, трэба старанна і ўважліва працаваць у класе і дома, імкнуцца размаўляць і чытаць па-беларуску не толькі на ўроках, але і ў вольны час.

Я спадзяюся, што з кожным годам вам будзе ўсё лягчэй і цікавей на ўроках беларускай мовы. У гэтым вам дапамогуць падручнік, які зараз перад вамі, і іншыя кнігі на беларускай мове.

Разгледзьце ўмоўныя абазначэнні, якія змешчаны на папярэдняй старонцы. Ці зразумелыя яны вам? Вучыцеся карыстацца імі.

Заўсёды пытайцеся ў настаўніка, калі вам незразумела заданне, слова ці выказванне. Ваша цікаўнасць дапаможа лепш авалодаць беларускай мовай.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

На ўроках мовы імкніцеся размаўляць па-беларуску. Але калі спачатку ў вас гэта не атрымаецца, дазваляецца гаварыць і па-руску.

Жадаю вам поспехаў у вывучэнні беларускай мовы.

?! Хто звяртаецца да вас?
Што вы зразумелі з гэтага тэксту? Адказваць можна па-руску.
Якія новы ўрок з'явіўся ў вашым раскладзе заняткаў?

**2.** Разгледзьце малюнак. Паслухайце тэкст.




У вучняў 5-га класа пачаўся цікавы ўрок. Гэта ўрок беларускай мовы. Настаўніца трымае ў руках новы падручнік. Ён называецца «Беларуская мова». Падручнік прыгожы.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вучні глядзяць на настаўніцу. Яны ўсміхаюцца. Дзеці будуць вучыць беларускую мову. Ім падабаецца вучыцца.

?! Які ўрок пачаўся ў дзяцей?
Што робіць настаўніца?
Якую кнігу яна трымае ў руках?
Ці прыгожая гэта кніга?
Які вучэбны прадмет з яе дапамогай будуць вывучаць дзеці?

**3.** Прачытайце назву свайго вучэбнага дапаможніка. Пагартайце яго. Ці шмат у ім малюнкаў?

Пакажыце малюнкі, якія вам спадабаліся. Ці хочацца вам даведацца, аб чым расказваецца ў вучэбным дапаможніку?

Паспрабуйце прачытаць любыя словы, назвы, паняцці, якія змешчаны ў кнізе.

Ці ўсе літары вы ведаеце?
Ці зразумелыя вам словы, што вы прачыталі?

**4.** Паслухайце тэкст.

Кожны народ мае сваю мову. У рускіх гэта руская мова. Ва ўкраінцаў — украінская. У немцаў — нямецкая. У англічан — англійская. Кожны народ ведае сваю мову, размаўляе на ёй і ганарыцца ёю.

Мы жывём у Беларусі. Родная мова нашага народа — беларуская. Нам таксама трэба яе ведаць і карыстацца ёю. Таму мы будзем вывучаць беларускую мову.

?! На якой мове размаўляюць рускія? Украінцы? Палякі? На якой мове размаўляеце вы?
Якая нацыянальная мова беларускага народа?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**5.** Паслухайце тэкст.

## Твая мова

Кожны народ любіць сваю мову.

Кожны немец умее гаварыць па-нямецку, француз — па-французску, рускі — па-руску, паляк — па-польску. Але ёсць беларусы, якія не ўмеюць гаварыць па-беларуску.

Дык давай гаварыць па-беларуску! Дзе б ты ні быў: дома ці ў школе, у вёсцы ці ў горадзе. Вучы гаварыць свайго брацІка і сястрычку на роднай мове.

Гавары па-беларуску ветліва. Каб і іншым, хто цябе пачуе, хацелася гаварыць па-беларуску.

*(Анатоль Клышка)*

На якіх мовах размаўляюць народы розных краін?
Да чаго заклікае вас аўтар тэксту?
Ці згодны вы выконваць яго заклік?

Спішыце сказ, у канцы якога стаіць клічнік. Першае слова сказа пішыце з вялікай літары.

*народ, па-французску*

**6.** Разгледзьце і прачытайце, як падпісваюцца сшыткі па беларускай мове.

*Сшытак*
*для работ па беларускай мове*
*вучня 5 класа*
*дапаможнай школы № 10 г. Мінска*
*Астапенкі Андрэя*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Сшытак*
*для работ па беларускай мове*
*вучаніцы 5 класа*
*Ельскай дапаможнай школы*
*Каліноўскай Кацярыны*

?! Якія літары вам невядомыя?

**Ii — гэтая літара адпавядае рускай літары *И и.***
**ў — гэтая літара называецца *у нескладовае (у кароткае)*.**
**Яна часта ўжываецца замест рускіх літар *в, л.***

Вазьміце сшыткі.
Падпішыце іх, як паказана на ўзоры.

**7.** Запішыце ў сшытках дату так, як на ўзоры.

*5 верасня*
*Класная работа*

Ве́расень — беларуская назва першага асенняга месяца. *Рус.*: сентябрь.

?! Як па-беларуску называецца першы асенні месяц?
Напішыце некалькі разоў яго назву ў сшытак.
Запішыце кожны па чарзе на дошцы літары ***і, ў (у нескладовае)***.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Напішыце ў сшытках па два радкі гэтых літар. Пішыце прыгожа, як на ўзоры.

*Іі Іі Іі …*

*Ўў Ўў Ўў …*

**8.** Паслухайце тэкст.

Мая родная мова —
ручайкоў перазвон,
птушак шчэбет вясновы,
калыханка на сон.

Люба кожнае слова:
мама, ластаўка, клён.
Будзе жыць мая мова —
ручайкоў перазвон.

*(Іра Крыўчун)*

П а э́ т — чалавек, які піша вершы.

Ці зразумелі вы, аб чым гэты верш?
Якія словы ў вершы вам незразумелыя?
Ці любіць сваю родную мову аўтар верша?
Як называюцца людзі, якія пішуць вершы?

**9.** Прачытайце словы, якімі аўтар верша апісвае родную мову.

Перазвон ручайкоў, шчэбет птушак, калыханка, мама, ластаўка, клён.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Паслухайце, як чытае гэтыя словы настаўніца.
Разам з настаўніцай прачытайце гэтыя словы яшчэ раз.
Якія словы пішуцца і чытаюцца так, як у рускай мове? А якія адрозніваюцца ад рускіх?
Якія гукі гучаць інакш, чым у рускай мове?

Запішыце словы ў сшыткі паводле ўзору.

*перазвон ручайкоў, шчэбет птушак,*
*калыханка, мама, ластаўка, клён*

**10.** Паслухайце тэкст.

Верш пра родную мову, які вы прачыталі на старонцы 8, напісала дзяўчынка, школьніца. Ён быў надрукаваны ў часопісе «Вясёлка». «Вясёлка» — гэта часопіс на беларускай мове для дзяцей. У ім змяшчаюцца вершы, апавяданні, казкі, жарты, смяшынкі, якія напісалі пісьменнікі, а таксама звычайныя дзеці, школьнікі.

Апавяда́нне — невялікі мастацкі твор. *Рус.*: рассказ.
Верш — невялікі мастацкі твор, напісаны мовай, якая мае рытм і рыфму. *Рус.*: стихотворение.
Вясёлка — шматкаляровая дугападобная паласа на небе, якая ўзнікае ад праламлення сонечных прамянёў у дажджавых кроплях. *Рус.*: радуга.
Ка́зка — апавядальны твор пра выдуманыя падзеі, пераважна з удзелам чарадзейных фантастычных сіл. *Рус.*: сказка.
Пісьме́ннік — той, хто піша літаратурныя творы. *Рус.*: писатель.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Часóпіс** — перыядычнае выданне ў выглядзе кніжкі, у якой змешчаны артыкулы або мастацкія творы розных аўтараў. *Рус.*: журнал.

**11.** Вазьміце часопіс «Вясёлка». Пагартайце яго.
Разгледзьце вокладку часопіса.
Што схавана ў кожнай літары назвы?
Намалюйце ў сшытках такія ж літары, каб яны ўтварылі слова *вясёлка*.
Разгледзьце малюнкі ў часопісе. Ці шмат іх там?
Прачытайце 1–2 назвы твораў, якія змешчаны ў часопісе.
Знайдзіце прозвішчы аўтараў.
Знайдзіце ў часопісе апавяданне, казку, верш.
Як вы іх знайшлі? Што вам дапамагло?
Растлумачце значэнне слова *вясёлка*. Як вясёлка называецца па-руску?
А як называецца па-руску *часопіс*?

**12.** Прачытайце ўзоры пісьма.

*«Вясёлка» – беларускі часопіс для дзяцей.*

Запішыце ў сшыткі сказ так, як на ўзоры.

**13.** Намалюйце сапраўдную вясёлку. Якія колеры яна мае?





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Чырвоны, аранжавы, жоўты, зялёны, блакітны, сіні, фіялетавы.

?! Прачытайце назвы колераў вясёлкі.
Скажыце, як на рускай мове гучаць назвы гэтых колераў.

**14.** Паслухайце верш.

**Роднае слова**

Да позняга вечара
кнігу вучу,
за новай чытанкаю
спаць не хачу.

Мне бацька гаворыць:
ты з кнігай дружы,
ты роднае слова,
сынок, беражы.

І слова, і песню,
што ў полі пяюць,
шануй, як Радзіму,
як маці сваю.

*(Вера Вярба)*

?! Які наказ дае бацька свайму сыну?
Як вы думаеце, ці выканае хлопчык наказ бацькі? Чаму вы так думаеце? Паразважайце.

Прачытайце верш самастойна.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**15.** Паслухайце верш.

### Алфавіт

Ад А да Я
алфавіт — адна сям’я.
Літары пабраліся
ў радках за рукі,
дружна ў словы скламіся,
бы ў гаворцы — гукі.

Каб яны не зблыталі
месцы незнарок,
завучыце літары
на-зу-бок!

*(Артур Вольскі)*

Што такое алфавіт?
Ці памятаеце вы рускі алфавіт? Паўтарыце яго.

> **А л ф а в і т — гэта ўсе літары мовы, размешчаныя ў пэўным парадку; азбука.**
> **Л і т а р ы мы бачым, пішам і чытаем. Г у к і чуем і вымаўляем.**

**16.** Слухайце, як гучаць назвы літар беларускага алфавіта, сачыце, як яны пішуцца.

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| *Аа* | *Бб* | *Вв* | *Гг* | *Дд* | *(Дж* | *Дз)* |
| а | бэ | вэ | гэ | дэ | (джэ | дзэ) |
| *Ее* | *Ёё* | *Жж* | *Зз* | *Іі* | *й* | |
| е | ё | жэ | зэ | і | і нескладовае | |


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Кк | Лл | Мм | Нн | Оо | Пп | Рр |
| ка | эл | эм | эн | о | пэ | эр |
| Сс | Тт | Уу | ў | Фф | Хх | Цц |
| эс | тэ | у | у нескладовае | эф | ха | цэ |
| Чч | Шш | ы | ь | Ээ | Юю | Яя |
| чэ | ша | ы | мяккі знак | э | ю | я |

?! Паўтарыце за настаўніцай назвы літар беларускага алфавіта.

**17.** Успомніце рускі алфавіт.

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Аа | Бб | Вв | Гг | Дд | Ее | Ёё | Жж | Зз | Ии | й |
| Кк | Лл | Мм | Нн | Оо | Пп | Рр | Сс | Тт | Уу | Фф |
| Хх | Цц | Чч | Шш | Щщ | ъ | ы | ь | Ээ | Юю | Яя |

?! Параўнайце рускі і беларускі алфавіты. Ці шмат у чым яны адрозніваюцца?

Якіх літар рускага алфавіта няма ў беларускім?

Якіх літар беларускага алфавіта няма ў рускім алфавіце?

**18.** Паслухайце тэкст пра алфавіт.

Беларускі і рускі алфавіты вельмі падобныя. Амаль усе літары ў іх аднолькавыя. У беларускай мове няма літар ***щ, ъ***. Рускай літары ***и*** адпавядае беларуская ***і***. У беларускай мове ёсць літара ***ў (у нескладовае ці у кароткае)***. Ёсць таксама знак ***апостраф (’)***, які ўжываецца там, дзе ў рускай мове ставяць раздзяляльныя цвёрды ці мяккі знакі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Паўтарыце назву літары, якой няма ў рускай мове.
Як называецца знак ’?

**19.** Запішыце ў сшытку беларускі алфавіт. Абвядзіце алоўкам літары, якіх няма ў рускай мове.
Пішыце літары прыгожа, як на ўзоры ў практыкаванні 16.

**20.** Паслухайце верш пра алфавіт.

Літары ад А да Я —
пчолы з дружнага раю́.
Носяць мёд у соты ведаў,
просяць, каб усё ты ведаў.
Паступова, пакрысе
іх запомніць трэба ўсе.
Ведай, да навук ахвочы,
азбука — вучэння вочы.
Азбука ад А да Я —
спадарожніца твая.
У краіну ведаў шлях
пачынаем па складах.

*(Рыгор Барадулін)*

З чым параўноўвае паэт азбуку (алфавіт)?
Навошта трэба ведаць літары?

**21.** Разгледзьце фотаздымкі.










Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Скажыце на падставе фотаздымкаў, у якіх выпадках неабходна веданне алфавіта.

**22.** Адгадайце з дапамогай малюнка загадку.

Яны чорныя, крывыя,
з нараджэння ўсе нямыя,
а калі пастануць поруч,
як жывыя, загавораць.



Ці пазналі вы літары на малюнку? Назавіце іх.
Запішыце ў сшытку адгадку гэтай загадкі.
Як па-руску вы скажаце гэтую адгадку?

*Літары*

**23.** Прачытайце літары.

*і ў б а к л р т ц ч ю я ь з ё*

Ці ўсе літары вы пазналі?

Запішыце літары ў алфавітным парадку.
Якія літары беларускага алфавіта прапушчаны?

**24.** Паслухайце верш.



З плота выламана палка,
і на палку села галка
і не круціцца — ані!
Паглядзіце: вось вам ***і***.

Ад рагаткі галубок
не ляціць чамусьці ўбок.
Я з-за дрэўца падышоў,
***у кароткае*** знайшоў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вось апостраф ’. Гэта знак.
Вельмі важны ён аднак.
З’езд, пад’езд — напішам проста,
Калі ўспомнім пра апостраф.

*(Артур Вольскі)*

?! Што паэту нагадваюць літары ***і, ў***?

Напішыце беларускія словы *з’езд, пад’езд*, як на ўзоры.

*з’езд* *пад’езд*

*съезд* *подъезд*

Якая літара стаіць у рускіх словах на тым месцы, дзе ў беларускіх словах апостраф?

Навучыцеся пісаць слова *апостраф*.

**25.** Параўнайце словы ў слупках.

| | |
|---|---|
| іней | иней |
| мір | мир |
| алфавіт | алфавит |
| воўк | волк |
| аўтобус | автобус |
| даў | дал |

?! У якіх слупках словы запісаны на рускай мове? У якіх — на беларускай?
Якімі літарамі адрозніваюцца словы?
Якія літары ўжыты на месцы ***ў*** у рускіх словах?

Запішыце беларускія словы. Падкрэсліце літары, якімі яны адрозніваюцца ад такіх жа рускіх слоў.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**26.** Прачытайце верш на рускай мове. Якая прафесія ў Айбаліта?

Добрый доктор Айболит!
Он под деревом сидит.
Приходи к нему лечиться
и корова, и волчица,
и жучок, и червячок, и медведица!

*(По Корнею Чуковскому)*

Запішыце ў алфавітным парадку спачатку на рускай мове, а пасля на беларускай назвы жывёл, якіх лячыў Айбаліт. Падкрэсліце ў беларускім варыянце літары, якіх няма ў рускім алфавіце.

*Выкарыстайце словы*: карова, ваўчыца, жучок, чарвячок, мядзведзіца.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# Поры года. Восень

**27.** Прачытайце верш.



**Восень**

Адшумела лета
роснымі лугамі,
апусцела поле,
нівы адцвілі.

Праплываюць хмары
нізка над стагамі,
і ляцяць у вырай
з крыкам жураўлі.



На рабіне скачуць
шустрыя сініцы,
пад дажджом намоклі
клёны і дубы.



Наліліся сокам
спелыя брусніцы,
і каля дарогі
выраслі грыбы.



*(Сяргей Грахоўскі)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**В ы́ р а й** — цёплыя краіны, куды адлятаюць на зіму пералётныя птушкі.

Аб якой пары года гэты верш?
Сумная ці вясёлая гэта пара года? Чаму?
Разгледзьце малюнкі. Знайдзіце радкі ў вершы, да якіх падыходзяць гэтыя малюнкі.
Прачытайце гэтыя радкі.

**28.** Прачытайце слова.

*восень*

Запішыце слова *восень*, як на ўзоры.
Назавіце ўсе літары, якія ёсць у гэтым слове.
Якія ў гэтым слове гукі?

**Гукі падзяляюцца на галосныя і зычныя.**
**Г а л о с н ы я гукі ў беларускай мове гучаць гэтак, як у рускай.**
**Некаторыя з ы ч н ы я гукі беларускай мовы гучаць інакш, чым у рускай.**

**29.** Паслухайце сказы.

*Увосень за стол просім.*
*Восень на шэрым коні ездзіць.*
*Увосень і верабей сыты.*

Вы паслухалі народныя выказванні пра восень.
У якіх з іх гаворыцца аб тым, што восень — багатая пара года?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

З якога выказвання можна зразумець, што восенню ідуць дажджы, часта бываюць пахмурныя дні?

*шэ́ры, е́здзіць.*

Спішыце народныя выказванні пра восень, як на ўзоры.

**30.** Прачытайце алфавіт.

*Аа Оо Уу ы Ээ Іі Ее Ёё Юю Яя*

*Бб Вв Гг Дд Жж Зз й*

*Кк Лл Мм Нн Пп Рр Сс Тт ў*

*Фф Хх Цц Чч Шш*

Назавіце тыя літары беларускага алфавіта, якія абазначаюць галосныя гукі.

Назавіце літары зычных гукаў.

Як у рускай мове называюцца галосныя і зычныя гукі?

Запішыце спачатку літары галосных гукаў, а пасля — зычных. Пішыце іх як на ўзоры.

**31.** Пагуляйце: пакажыце рухамі, што адбываецца восенню.

Ідзе дождж.
Ападае лісце.
Вецер гойдае дрэвы.
Скачам цераз лужы.
Ірвём яблыкі.
Капаем бульбу.
Саджаем дрэўцы.
Развітваемся з птушкамі, якія адлятаюць у вырай.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**32.** Паслухайце верш.

### Асенні дождж

Сыплюцца кроплі часта і дробна,
**ціха** па стрэсе бубняць,
смутак **наводзіць** шум іх жалобны,
смутку таго не суняць.
Сыплюцца кроплі **часта** і дробна,
у **сцены**, у вокны бубняць,
смутна іх песня, **пла́чу** падобна,
смутку ж ніяк не суняць.

*(Якуб Колас)*

С м у́ т а к — пачуццё суму, маркоты, журбы. *Рус.*: грусть, печаль.

С т р а х а́ — верхняя покрыўная частка будынка, якая засцерагае яго ад дажджу, снегу. *Рус.*: крыша.

Прачытайце выдзеленыя словы. Ці адрозніваецца іх гучанне ў рускай мове?

Запішыце выдзеленыя словы па-беларуску і па-руску паводле ўзору. Параўнайце іх напісанне.

*У з о р. Ціха — тихо, ...*

**33.** Прачытайце словы.

Дажджы, вырай, дарога, ездзіць, дрэвы.

Навучыцеся правільна вымаўляць некаторыя адметныя гукі беларускай мовы, якія ёсць у гэтых словах. Паўтарайце словы за настаўнікам.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**У беларускай мове ёсць некалькі гукаў, якія вельмі адрозніваюцца ад рускіх, а таксама гукі, якіх зусім няма ў рускай мове.**

**[г] — гук вымаўляецца не звонка, з выбухам, як у рускай мове, а глуха, працяжна.**

**[ў] — вымаўляецца коратка, як [й]. У рускай мове такога гука няма.**

**[дж] — вымаўляецца злітна. Гэты гук заўсёды цвёрды. У рускай мове такога гука няма.**

**[дз’] — вымаўляецца злітна. Гэты гук заўсёды мяккі. У рускай мове такога гука няма.**

**[р] — у беларускай мове заўсёды цвёрды.**

**[ч] — у беларускай мове заўсёды цвёрды.**

**[т] — у беларускай мове толькі цвёрды.**

**34.** Паслухайце верш.

Джа-джа-джа — багаты ўраджай,
джу-джу-джу — па саду хаджу,
джы-джы-джы — ідуць дажджы.
Дзі-дзі-дзі — на вуліцу ідзі,
дзе-дзе-дзе — лодка на вадзе,
дзі-дзі-дзі — грыбочкі знайдзі,
дзе-дзе-дзе — вырас на градзе.

Навучыцеся вымаўляць гукі беларускай мовы ***дж*** і ***дз’***.
Вывучыце адну з чыстагаворак на памяць. Навучыцеся яе выразна вымаўляць.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**35.** Разгледзьце малюнкі.








Рабіна, каліна, бульба, грыбы, морква, буракі.

?! Якімі дарамі багатая восень?
Як называюцца ў рускай мове прадметы, што адлюстраваны на гэтых малюнках?

Навучыцеся правільна вымаўляць гэтыя словы па-беларуску.
Якія яшчэ дары восені вы ведаеце?

**36.** Прачытайце сказ.

*Дары восені: бульба, яблыкі, грыбы, морква, буракі, рабіна, каліна.*

?! Спішыце сказ прыгожа, як на ўзоры.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**37.** Паслухайце верш.

### Урадзіла бульба

Урадзіла бульба
на сялянскім полі,
гэткай добрай бульбы
не было ніколі.

Мы яе капаем,
у бурты складаем,
сёстрам, мамкам, бабкам
мы дапамагаем.

*(Авяр'ян Дзеружынскі)*

Ці капалі вы калі-небудзь бульбу?
Ці лёгкая гэта праца?
Вы любіце есці бульбу?
Якія вы ведаеце стравы з бульбы? Назавіце іх.
Смачныя з бульбы стравы або не?
Назавіце ў слове *бульба* літары і гукі.
Колькі ў гэтым слове складоў? На які склад падае націск — на першы ці на другі?

Запішыце слова *бульба,* дзелячы яго на склады. Пастаўце націск.

**Словы дзеляцца на склады.**
**Адзін са складоў вымаўляецца з большай сілай. Такі склад з'яўляецца націскным.**

Склад — гук або спалучэнне гукаў, што вымаўляюцца адным штуршком выдыхнутага паветра. *Рус.*: слог.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Нáціск** — вылучэнне (складу, слова) сілай голасу або павышэннем тону, а таксама значок, які паказвае такое вылучэнне. *Рус.*: ударение.

**38.** Паслухайце верш.

## Грыбы



*Абабак*

Нам сказалі, што за борам,
дзе растуць адны дубы,
зацвіла зямля і скора
ў лесе з'явяцца грыбы.

Дзён праз сем, а можа, дзесяць,
не забыўшы гэтых слоў,
мы ўсямёх сышліся ў лесе
і пайшлі шукаць грыбоў.



*Мухаморы*

Мы хадзілі, мы шукалі,
кожны кусцік аглядалі, —
хоць бы дзе адзін грыбок,
толькі мох ды верасок,
ды навокала палянкі
чарадой раслі паганкі,
ды пад сонцам на прасторы
чырванелі мухаморы.



*Паганкі*

Мы гадалі, што за ліха?
А грыбы сядзелі ціха,
так схаваўшыся ў мох,
што не толькі белых ног —
не відаць было і шапак.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ды не выцерпеў абабак:
з моху выглянуў, гарэза.
Я нагнуўся яго зрэзаць.
А нагнуўся, аглянуўся —
і ад радасці схіснуўся:
ля абабка — махавік,
а наводдаль — чашчавік,
а за імі каля сцежкі —
чарадою сыраежкі
і, як родныя сястрычкі,
маладзенькія лісічкі.



*Махавік*



*Сыраежкі*

Я сяброў сваіх склікаю,
далей-болей аглядаю:
паміж леташніх лістоў
чырванее асавік,
а за ім — кароль грыбоў,
сам магутны баравік.



*Лісічкі*

Я набраў іх цэлы кошык,
палажыў наверсе ножык
і падумаў, што кашолкі
і сябрам ільга набраць,
калі толькі, калі толькі,
добра ўмеючы, шукаць.

Трудна першы грыб здабудзеш,
а другі ўжо сам ідзе,
бо яны, як мы, як людзі,
любяць жыць у грамадзе.

*(Пятро Глебка)*



*Баравікі*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Гарэ́за** — свавольнік, непаседа.

**Ільга́** — можна.

?! Раскажыце пра падзеі, якія апісваюцца ў вершы. Што адбылося спачатку? Што потым? Ці адразу сябры знайшлі грыбы? Якія грыбы яны бачылі ў лесе?

Выпішыце з верша назвы грыбоў. Пастаўце ў гэтых словах націск. Укажыце колькасць складоў.

*Узор. Па-га́н-кі — 3 склады, ...*

**39.** Разгледзьце малюнак.



?! Адкажыце на пытанні.
Чаму дзеці пайшлі ў лес?
У якую пару года збіраюць грыбы?
Калі лепш ісці ў грыбы: зранку ці пазней?
Ці збіралі вы грыбы?
Якія грыбы вы ведаеце?
Адкажыце пісьмова на першае пытанне. Запішыце ўсе словы, падзяляючы іх на склады. Пастаўце націскі ў словах.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**40.** Прачытайце сказы.

Прыйшла на **зямлю** восень. Ідзе сумны **дождж.** Буслы паляцелі ў **вырай.**

Падзяліце на склады выдзеленыя словы. Якое з гэтых слоў мае толькі адзін склад? Як вы гэта вызначылі?

Запішыце выдзеленыя словы, дзелячы іх на склады. Пастаўце ў іх націск.

**41.** Паслухайце загадкі.

## Загадкі на градках

У гародзе каля градак
шмат цікавых ёсць загадак.
Той, хто градкі даглядае,
той загадкі адгадае.



От бабуля важна села
і глядзіць навокал смела.
У зямлю схавала лапаць.
Як зачэпіш, будзеш плакаць.
Гэта злосная бабуля
называецца....

У бабулі родны брат
ласкавейшы быццам.
А да слёз давесці рад
так, як і сястрыца.
Ты не вельмі плач, сынок,
калі шчыплецца....





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Гэта што за важны туз,
хвост зялёны,
чэпкі вус?
Усім вядомы
карапуз
Пузан Пузанавіч....



З вусамі,
а не стары.
Зайздросныя вочы.
За што-небудзь на двары
ўчапіцца хоча.
Хопіць хітрасці на трох.
Ну, на тое ж ён....



*(Рыгор Барадулін)*

?! Адгадайце з дапамогай малюнкаў «агародныя» загадкі. У якую пару года бываюць такія дары?

Напішыце словы-адгадкі. Падзяліце іх на склады. Пастаўце націск.

**42.** Паслухайце верш.

### У верасні

У верасні,
у верасні
хапае ўсім турбот.
Дзятва да школы
ў верасні
спяшаецца штогод.

*(Артур Вольскі)*

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Т у р б о́ т ы — заклапочанасць чым-небудзь, жаданне ажыццявіць што-небудзь. *Рус.*: заботы.

Якім па ліку асеннім месяцам з’яўляецца верасень — першым, другім ці трэцім?
Ці ведаеце вы беларускія назвы астатніх асенніх месяцаў?
Навучыцеся чытаць верш.

*верасні, усім, дзятва, спяшаецца, штогод*

**43.** Прачытайце сказ.

Верасень, кастрычнік, лістапад — назвы асенніх месяцаў.

К а с т р ы́ ч н і к — назва другога асенняга месяца.

Л і с т а п а́ д — назва трэцяга, апошняга месяца восені.

Запомніце назвы асенніх месяцаў. Колькі складоў у кожнай назве? На якія склады падае націск?

Запішыце назвы асенніх месяцаў, як на ўзоры.

*ве-ра-сень, каст-рыч-нік, ліс-та-пад*

*лістапад, асенніх, месяцаў*

**44.** Паслухайце верш.

**Лістапад**

З буйных ліп і бяроз
лісты валяцца,
між павалаў і лоз
рассыпаюцца.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Шапацяць, шалясцяць,
залацістыя,
увысь галінкі глядзяць
пусталістыя.

*(Янка Купала)*

?! Знайдзіце ў вершы словы, якія складаюцца толькі з аднаго склада.
Як вы іх вызначылі? Запішыце гэтыя словы.

**У слове столькі складоў, колькі ў ім галосных.**

**45.** Паслухайце чыстагаворкі.

Аў-аў-аў — ліст напісаў,
оў-оў-оў — прыйшоў дамоў,
іў-іў-іў — кошку пакарміў,
еў-еў-еў — Вова кашу з’еў.
Ча-ча-ча — злавілі ляшча,
чо-чо-чо — возьмем на плячо,
чу-чу-чу — да Месяца лячу,
чы-чы-чы — сядзім на пячы,
ач-ач-ач — ніколі не плач,
оч-оч-оч — цёмная ноч.

?! Навучыцеся правільна вымаўляць беларускія гукі ***ў***, ***ч***.
Паўтарайце чыстагаворкі за настаўнікам.

**46.** Прачытайце сказы.

Чарадзейны верасень заквітнеўся верасам.

*(Авяр’ян Дзяружынскі)*

У садзе ў лістападзе апошні ліст ападзе.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Якія зычныя гукі часта паўтараюцца ў першай скорагаворцы? У другой? Якімі літарамі яны перададзены на пісьме? Колькі складоў у кожным слове скорагаворак?

Навучыцеся чытаць скорагаворкі хутка. Паспаборнічайце: хто лепш вымавіць скорагаворкі па памяці.

Спішыце скорагаворкі ў сшыткі.

**[Дз’] — адзін гук. Чытайце яго злітна. Гэта мяккі гук.**

**47.** Паслухайце ўрыўкі з вершаў.

Ярка, хораша прыбрала
ўсюды дрэвы і кусты
і зямлю намалявала
ў колер жоўта-залаты.

*(Сяргей Новік-Пяюн)*

Сыплюць лісцікі бярозы,
стала ветрана і суха —
недалёка ўжо марозы,
люты вецер, завіруха.

*(Станіслаў Шушкевіч)*

У якім з урыўкаў расказваецца пра пачатак восені, а ў якім — пра канец?
Ці чулі вы выраз *залатая восень*?
Што азначае гэты выраз?
У якім урыўку расказваецца пра залатую восень?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**48.** Разгледзьце фотаздымкі.





?! На якім з фотаздымкаў адлюстравана залатая восень?
На якім фотаздымку мы бачым познюю, невясёлую, пахмурную восень?
Якія колеры падыходзяць для апісання ранняй восені?
Якія колеры падыходзяць для апісання позняй восені?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**49.** Прачытайце сказы.

*Ранняй восенню ў прыродзе шмат чырвонага, жоўтага, аранжавага колераў. Позняй восенню больш карычневага і шэрага колераў.*

Запішыце сказы ў сшытку па ўзоры.

**50.** Паслухайце тэкст.

## Сябры дапамаглі

У класе ціха-ціха. У другакласнікаў урок малявання. Учора яны хадзілі ў лес, а сёння настаўніца сказала, каб кожны намаляваў тое, што яму спадабалася ў лесе.

Толіку спадабаўся грыб мухамор. Ён стаяў пад дрэвам у чырвоным капелюшы.

— Сапраўдны начальнік станцыі! — аж усклікнуў Толік, як убачыў яго.

А Толікава суседка Верачка намалявала рабіну і цяпер прыбірае яе ў чырвоныя каралі. Яна так захапілася працай, нават кончык языка высунула. Але вось бяда: не паспела Верачка намаляваць і паловы караляў, як раптам — трах! — і зламаўся яе чырвоны аловак.

— Толік, дай мне тваю тачылку, — папрасіла Верачка свайго суседа.

— А дзе твая?

— У мяне няма.

— Чаму ж ты мне пра гэта раней не сказала? Я табе сваю старую прынёс бы. Яна крыху затупілася, але аловак яшчэ завастрыць можа. Я табе заўтра яе абавязкова прынясу.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Мне трэба зараз, а не заўтра, — пакрыўдзілася Верачка.

— А дзе ж я табе вазьму? Яна ў мяне дома засталася.

— Дык у цябе ж вунь новая тачылка ляжыць, — сказала Верачка.

— Э, не! — пакруціў галавой Толік. — Новай тачылкі я табе не дам. Калі я пачну яе ўсім даваць, дык яна хутка затупіцца, — адказаў Толік і схаваў тачылку ў пенал.

— Скнара! — сказала дзяўчынка і заплакала.

— Верачка, чаго ты плачаш? — запытала ў дзяўчынкі настаўніца.

— Мой чырвоны аловак зламаўся. Чым я цяпер намалюю каралі на сваёй рабіне? — усхліпваючы, прамовіла Верачка.

Настаўніца абвяла вачамі прыціхлы клас і запытала:

— Дзеці, хто можа даць Верачцы чырвоны аловак?

І не паспела яна гэта сказаць, як да Верачкі з усіх бакоў пацягнуліся рукі з алоўкамі. Кожны падаваў ёй свой аловак, кожны хацеў дапамагчы Верачцы. А Толік нізка-нізка схіліўся над сшыткам, нібы нічога не чуў і не бачыў. Толькі вушы ў яго зрабіліся чырвоныя-чырвоныя.

*(Ядвіга Бяганская)*

К а п я л ю́ ш — мужчынскі ці жаночы галаўны ўбор.

К а р а́ л і — пацеркі з каралавых або іншых каштоўных камянёў. *Рус.*: бусы.

С к н а́ р а — вельмі скупы чалавек. *Рус.*: жадина.

?! Які ўрок быў у дзяцей? Якое заданне яны атрымалі? Што маляваў Толік?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Што хацела намаляваць Верачка? Што ў яе здарылася?
Ці дапамог ёй Толік? Чаму?
Хто дапамог ёй?
Чаму ў Толіка пачырванелі вушы?

**51.** Уявіце, што ў вас ідзе ўрок малявання, як у дзяцей з апавядання «Сябры дапамаглі». Адкажыце на пытанні.

Ці бывалі вы восенню ў лесе?
Што вам там спадабалася?
Вазьміце каляровыя алоўкі і намалюйце тое, што вы бачылі ў асеннім лесе. Глядзіце на малюнкі-ўзоры.





Раскажыце, што вы намалявалі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# Наша Радзіма



**52.** Паслухайце сказы.

Мы жывём у Беларусі.
Наша Радзіма цудоўная.
Наша Радзіма прыгожая.
Мы любім свой родны край.

Паўтарыце сказы за настаўнікам.
Правільна вымаўляйце гукі беларускай мовы.
Прачытайце сказы самі. З якой літары, вялікай ці малой, напісаны словы *Беларусь*, *Радзіма*? Якія яшчэ словы напісаны з вялікай літары? Чаму?

Запішыце апошні сказ на дошцы і ў сшытках.

**Сказ — гэта адно або некалькі слоў, якія выказваюць закончаную думку.**
**Першае слова сказа пішацца з вялікай літары. У канцы сказа ставяць кропку (.), пытальнік (?) ці клічнік (!).**

**53.** Адкажыце на пытанні.

Як называецца наша Радзіма?
Вялікая ці малая гэта краіна?
Што адметнае ў прыродзе ёсць у Беларусі?
Якія гарады вы ведаеце?
Які горад — сталіца Беларусі?
Ці далёка ад Мінска жывяце вы?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**54.** Паслухайце тэкст.

Кожны чалавек, дзе б ён ні нарадзіўся, вельмі любіць сваю Радзіму. Не выключэнне і беларусы.

Вось як пісаў аб нашай агульнай Радзіме народны паэт Беларусі Якуб Колас:

Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе не маю сілы!

Паўтарыце за настаўніцай радкі з верша.
Паслухайце песню, якая створана кампазітарам Ігарам Лучанком на словы гэтага верша, у запісе ці ў выкананні настаўніка.
Ці спадабалася вам песня? Чым яна вам спадабалася?
Паспрабуйце праспяваць некалькі радкоў песні.

**55.** Разгледзьце фотаздымкі.





Ці прыгожая прырода нашай краіны?
Чаго шмат на Беларусі? (лясоў, рэк, азёр)
Якія гарады, рэкі, азёры Беларусі вы ведаеце?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**56.** Паслухайце верш.

### Наш родны край прыгожы самы

Вядома ўсім, што вельмі шмат
куткоў на свеце дзіўных.
Але не менш, а болей, брат,
іх на тваёй радзіме,
у нашым краі дарагім,
у Беларусі роднай.
Не памяняешся ні з кім
яе красою годнай.

*(Іван Муравейка)*

**Го́дны** — *тут*: дастойны, варты чаго-небудзь.

Ці згодны вы з думкамі, якія выказваюцца ў вершы? Колькі ў вершы сказаў?

Спішыце сказ — назву верша. Правільна пішыце сказ: пачніце з вялікай літары, а ў канцы пастаўце кропку.

**57.** Паслухайце верш аб любові да роднага краю, напісаны школьніцай Вітай Ярчак. Ён быў змешчаны ў часопісе «Вясёлка».

### Родны кут

Той кут, дзе звіняць каласы,
дзе сцежачкі ўюцца змейкай,
дзе птушак чуваць галасы, —
завецца роднай зямелькай.
Той кут, дзе ў лепшае вераць,
дзе кожная раніца — дзіва,
дзе ўсё адгукаецца ў сэрцы, —
завецца тваёй **Радзімай**.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прачытайце верш самастойна.
Чаму выдзеленае слова напісана ў вершы з вялікай літары?
Правільна вымаўляйце гукі беларускай мовы. Паўтарыце наступныя словы ўслед за настаўнікам.

*дзе, звіняць, сцежачкі, уюцца, змейкай, галасы, зямелькай, раніца, дзіва, усё, адгукаецца, сэрцы, Радзімай*

**58.** Прачытайце сказы.

*У чужой старонцы не так свеціць і сонца.*

*Дзе маці нарадзіла, там і Радзіма.*

*На чужой старонцы і на печы холадна.*

*За родны край галаву аддай.*

У адным з прыведзеных выказванняў вызначаецца, якое месца мы лічым Радзімай. Назавіце гэтае выказванне.
У якім з гэтых выказванняў гаворыцца аб неабходнасці абараняць Радзіму?

Спішыце прыказкі ў сшыткі паводле ўзору.
З якой літары, вялікай ці малой, пачынаюць пісаць кожны новы сказ?
Які знак прыпынку стаіць у канцы кожнага з запісаных вамі сказаў?
Якое слова ў другой прыказцы напісана з вялікай літары? Чаму?

*свеціць, чужой, дзе, нарадзіла, Радзіма, печы, галаву*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**59.** Паслухайце верш.

Не ахапіць яе вачамі —
нівы, пожня і ралля...
Скрозь яна перад намі —
наша маці-зямля.

Гэта ўсё дарагое
я ад малку люблю.
Як жа нам не любіць
нашу маці-зямлю!

Яна ж корміць і поіць,
апранае адна.
Выйдзі, глянь ты вясною,
як гамоніць яна.

Друг мой юны, таварыш,
тут мы ўсе ўзраслі.
Хіба лепей ёсць мары,
чым аб нашай зямлі?

*(Пятрусь Броўка)*

**Скрозь** — усюды; заўсёды, увесь час.

Як называе Радзіму паэт у гэтым вершы?
За што, на яго думку, трэба любіць Радзіму?
Прачытайце апошні сказ верша. Які знак прыпынку стаіць у канцы гэтага сказа?
Якія знакі прыпынку стаяць у канцы ўсіх астатніх сказаў?

**Зна́кі прыпы́нку** — знакі, якімі пазначаюцца сказы ці іх часткі. *Рус.*: знаки препинания.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

К л і́ ч н і к — знак прыпынку, які ставіцца ў канцы клічнага сказа. *Рус.*: восклицательный знак.

К р о́ п к а — знак прыпынку, які аддзяляе сказы, а таксама ўжываецца пры скарочаным напісанні слоў. *Рус.*: точка.

П ы т а́ л ь н і к — знак прыпынку, які ставіцца ў канцы пытальнага сказа. *Рус.*: вопросительный знак.

**60.** Паслухайце тэкст.

### Мая Радзіма

Мая Радзіма — гэта краіна, дзе я нарадзіўся. Гэта краіна маіх бацькоў і дзядоў. Мая Радзіма — Рэспубліка Беларусь. Яна вялікая і цудоўная.

Мінск — сталіца і самы вялікі горад Беларусі. Галоўная вуліца горада — праспект Незалежнасці. У цэнтры горада — плошча Перамогі, дзе ўзвышаецца помнік воінам і партызанам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Наша мова — беларуская. Яе дзеці вучаць у школах, на ёй выдаюцца газеты і часопісы. На роднай мове беларускія пісьменнікі пішуць цікавыя кнігі.

*(Паводле публікацыі з часопіса «Вясёлка»)*

?! Знайдзіце ў тэксце сказы, у якіх расказваецца пра сталіцу Беларусі. Прачытайце іх.

Якія словы ў гэтых сказах напісаны з вялікай літары? Што яны абазначаюць? Якія яшчэ словы ў тэксце напісаны з вялікай літары?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**61.** Прачытайце словы і спалучэнні слоў.

*Радзіма, Рэспубліка Беларусь, Мінск, Беларусь, праспект Незалежнасці, плошча Перамогі, Вялікая Айчынная вайна.*

?! Спішыце назвы ў сшыткі, як на ўзоры. Пішыце іх з вялікай літары.

**З вялікай літары пішуцца словы, якія абазначаюць у л а с н ы я  н а з в ы: прозвішчы, імёны і імёны па бацьку людзей, мянушкі жывёл, назвы краін, гарадоў, рэк, азёр, вёсак, вуліц, часопісаў, фабрык і г. д.**

**62.** Разгледзьце фотаздымак. Які на ім Мінск?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Паслухайце словы і спалучэнні слоў: *вялікі, прыгожы, маленькі, шматпавярховыя дамы, шырокія вуліцы, паркі, невялікія дамкі, вузенькія вулачкі.*

Якія з гэтых слоў і спалучэнняў слоў не падыходзяць для апісання Мінска?

Паслухайце іх яшчэ раз. Падымайце руку, калі названыя словы і спалучэнні слоў падыходзяць для апісання Мінска.

**63.** Прачытайце верш.

Мой родны Мінск,
пад небам жураўліным
жыві, квітней пад зоркай залатой.
Ты для мяне на ўсёй зямлі — адзіны,
цябе люблю я ўсёй душой.

*(Пімен Панчанка)*

Якія пачуцці да Мінска выказвае паэт у гэтым вершы? Чаго ён жадае Мінску? Адкажыце словамі з верша.

Спішыце ў радок першы сказ верша. Правільна афармляйце яго на пісьме: пачынайце з вялікай літары, а ў канцы пастаўце кропку. Якая назва ў гэтым сказе напісана з вялікай літары?

*жураўліным, усёй, адзіны, цябе*

**64.** Паслухайце тэкст.

Мінск — вялікі горад. У ім жыве шмат людзей. Тут многа шматпавярховых дамоў, заводаў, фабрык, школ, магазінаў, тэатраў, паркаў і сквераў.

У Мінску многа вуліц. Па іх ходзяць розныя машыны, аўтобусы, тралейбусы, трамваі. Ёсць у сталіцы Беларусі падземная чыгунка — метро.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ







У Мінску друкуюць газеты, часопісы, кнігі. Ваш падручнік надрукаваны таксама ў Мінску.

?! Прачытайце абзац тэксту, якому адпавядае першы малюнак.
Чаго шмат у Мінску?
Якія фотаздымкі адлюстроўваюць змест другой часткі тэксту?
Якія віды транспарту ёсць у Мінску?
Прачытайце абзац тэксту, у якім адлюстраваны змест трэцяга фотаздымка.
Якія словы напісаны ў тэксце з вялікай літары? Растлумачце, чаму.
Які знак прыпынку стаіць у канцы кожнага сказа? Як у рускай мове называецца гэты знак прыпынку?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**65.** Разгледзьце фотаздымкі.



Возера Нарач



Белавежская пушча



Касцёл св. Сымона і св. Алены



Брэсцкая крэпасць



Сафійскі сабор у Полацку



Курган Славы

?! Прачытайце подпісы пад фотаздымкамі.
З якой літары напісаны назвы знакамітых мясцін і помнікаў Беларусі? Што вы ведаеце пра іх?
Запомніце гэтыя назвы. Іх павінен ведаць кожны жыхар нашай краіны.

Спішыце назвы вядомых мясцін і помнікаў Беларусі. Пішыце іх з вялікай літары.

*возера, Нарач, Белавежская пушча, касцёл, крэпасць, курган*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**66.** Прачытайце назвы гарадоў.

**Ві́цебск, Го́мель, Нясві́ж, Брэст, По́лацк, Магілёў, О́рша, Ко́брын, Ашмя́ны, Рагачо́ў, Салігорск, Гро́дна.**

Звярніце ўвагу на націскі ў словах.
З якой літары напісаны ўсе назвы гарадоў?

Спішыце назвы гарадоў у алфавітным парадку. Карыстайцеся алфавітам. Пастаўце ў словах націск.

**У беларускай мове гукі літар *о, ё, э* заўсёды стаяць пад націскам.**

**67.** Правядзіце гульню «Беларускія гарады». Кожны рад называе па чарзе горад. Перамагае той рад, які апошнім назаве беларускі горад.

Гэтак жа правядзіце гульні «Нашы вёскі», «Рэкі Беларусі».

**68.** Адкажыце на пытанні.

Як называецца ваш горад або вёска?
Ваш горад (вёска) вялікі(ая) ці маленькі(ая)?
Ці ёсць паблізу ад вас возера або рака? Як яно (яна) называецца?
Ці бывалі вы ў лесе? Якія жывёлы там водзяцца? Якія ягады і грыбы вы збіралі?
Якія расліны растуць на лузе?
Якіх птушак вы бачылі паблізу ад свайго дома?
Ці любіце вы родны(ую) горад (вёску)?

Запішыце адказ на першае пытанне.
Назву горада ці вёскі пішыце з вялікай літары.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**69.** Разгледзьце фотаздымкі.






?! Якія з фотаздымкаў падобны да таго месца, дзе вы жывяце? Паспрабуйце расказаць пра ваш горад ці вёску.

Намалюйце ў сшытках ці на аркушы белай паперы з дапамогай каляровых алоўкаў горад ці вёску. Зрабіце адпаведны подпіс: «Мой горад» ці «Мая вёска».



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



# Будзем ветлівыя



**70.** Паслухайце ветлівыя выразы.

**Дзень добры, вітаю вас, прашу прабачэння, калі ласка, дзякую, будзьце ласкавы, смачна есці, да пабачэння, хлеб-соль, да сустрэчы.**

Паўтарыце ветлівыя словы і выразы беларускай мовы за настаўнікам.

Прачытайце іх самі.

З дапамогай якіх слоў вітаюцца? Развітваюцца? Просяць прабачэння? Жадаюць прыемнага апетыту? Выказваюць просьбу?

*дзень, прабачэння, дзякую, будзьце, есці, да пабачэння*

**71.** Прачытайце словы ці спалучэнні слоў на рускай мове.

**Здравствуйте, приветствую вас, прошу прощения, пожалуйста, спасибо, приятного аппетита, до свидания, до встречи.**

Якім ветлівым выразам і словам з практыкавання 70 адпавядаюць гэтыя рускія словы ветлівасці?

Пагуляйце: адзін рад чытае ветлівы выраз на рускай мове, другі — адпаведны яму беларускі выраз.

Пасля рады мяняюцца ролямі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**72.** Прачытайце сказы.

Ласкавае слова што вясновы дзень.
Добрае слова чуваць далёка.
Ветлівыя людзі ветліва размаўляюць.

Растлумачце гэтыя народныя выказванні. Спішыце сказы ў сшыткі паводле ўзору.

**73.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце подпісы пад імі.



— Дзень добры!



— Віншую!



— Калі ласка!



— Смачна есці!

Вы прачыталі ветлівыя словы аднаго з удзельнікаў размовы. Падумайце, якія ветлівыя словы ў кожнай сітуацыі трэба выкарыстаць у адказ.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**74.** Разыграйце сітуацыю. Звярніцеся да сябра або суседа па парце з просьбай. Папрасіце ручку, аловак, кнігу ці штонебудзь іншае.

Выкарыстайце ветлівыя словы: *калі ласка, будзь ласкавы, вялікі дзякуй, дзякую.*

*Узор.*

— Віця, дай мне, калі ласка, кнігу.

— Вазьмі.

— Вялікі дзякуй.

**75.** Паслухайце верш.

**Ветлівыя словы**

Калі ласка, дзякуй,
добры дзень —
ветлівыя словы
чую ад людзей.

Я таксама буду
імі даражыць:
з ветлівымі словамі
лёгка жыць.

*(Тадзіяна Кляшторная)*

Чаму лёгка жыць з ветлівымі словамі?
Знайдзіце ў вершы ветлівыя словы беларускай мовы. Калі яны ўжываюцца?

Запішыце ветлівыя словы, ужытыя ў вершы, у сшыткі, як на ўзоры. Прадоўжыце гэты рад ветлівых слоў.

*калі ласка, дзякуй, добры дзень, ...*

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**76.** Паслухайце тэкст.

Мне пазванілі ў дзверы. Я адчыняю. Перада мной стаяць тры дзяўчынкі. Яны вітаюцца:

— Добры дзень!

— Добры дзень! — адказваю ім.

— Ці не заходзіла да вас кошачка?

— Не.

— Прабачце, калі ласка, мы пойдзем.

На гэтым не хочацца развітвацца з імі, і я пытаюся:

— А як жа яе завуць?

— Маркіза.

Дзяўчынкі, зразумела, будуць шукаць кошачку ў суседзяў. Трэба дапамагчы ім.

— Калі Маркіза зойдзе да нас, дык я скажу ёй, што вы яе шукаеце.

— Дзякуем вам.

*(Паводле Янкі Брыля)*

Ці ветліва размаўляюць дзяўчынкі?
Якія словы ветлівасці яны выкарысталі?
Якія словы сказаны жартам? Ці зразумее кошачка, калі ёй скажуць, што яе шукаюць?

Разыграйце сітуацыю. Прачытайце размову дзяўчынак і дарослага чалавека.

**Размова двух або некалькіх чалавек называецца дыялогам.**



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**77.** Прачытайце верш.

Сціхла, задрамала
груша каля хаты.
Добрай ночы, мама!
Добрай ночы, тата!
Птушкі селі ў гнёзды
позняю часінай.
Добрай ночы, сёстры!
Добрай ночы ўсім вам!

*(Ніл Гілевіч)*

Якія ветлівыя словы ўжывае паэт у гэтым вершы?

Запішыце іх у сшытак.

**78.** Паслухайце дыялог.

## «Дзелавы шафёр»

Рыгорку падарылі машыну. Ездзіў ён па хаце, ездзіў, нарэшце прыпыніўся.

Мама кажа:

— А шафёр хто?
— Хто, хто! Панік у паліто.
— Куды едзеш?
— Куды, куды! На Кудыкіну гару.
— А дзе тая гара?
— Дзе, дзе! На барадзе.
— Чаго едзеш туды?
— Чаго, чаго? Прывезці таго-сяго.
— Шафёрык, давай снедаць!
— Не, мама, трэба ехаць!

*(Уладзімір Ліпскі)*

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Як вы лічыце, шафёр — дарослы мужчына ці маленькі хлопчык? Ці выкарыстоўваў ён ветлівыя словы ў размове з мамай? Як вы думаеце, чаму? Якія ветлівыя словы можна выкарыстаць у гэтай сітуацыі?

Прачытайце дыялог па асобах: адзін вучань чытае словы маці, другі — словы Рыгоркі.

**79.** Уявіце, што ваша маці запрашае вас абедаць.

Як яна гэта робіць? Што скажа? Што вы ёй адкажаце? Якія ветлівыя словы вы выкарыстаеце?

Разыграйце гэтую сітуацыю.

**80.** Уявіце наступныя сітуацыі.

1. Раніцай вы вітаецеся з выхавальніцай або настаўніцай. Якімі беларускімі ветлівымі словамі вы будзеце карыстацца?
2. Вы абедаеце ў школьнай сталоўцы. Якія ветлівыя словы вы скажаце адзін аднаму? Што адкажаце на пажаданне прыемнага апетыту? Як падзякуеце школьнаму повару за смачны абед?
3. Вечарам надышоў час класціся спаць. Што пажадаеце адно аднаму? Што адкажаце на пажаданне добрай ночы?

Разыграйце гэтыя сітуацыі.

**81.** Паслухайце тэкст.

## Добрае слова

У трамвай праз пярэднія дзверы ўваходзіў старэнькі дзядок. Хлопчык убачыў, як цяжка падымацца старому


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

чалавеку з нізкай прыступкі. Ён усхапіўся з лаўкі і падаў руку.

Дзядуля падзякаваў.

— Сядайце, калі ласка, на маё месца, — паказаў хлопчык на лаўку.

— Сядзі-сядзі. Мне недалёка ехаць.

Хлопчык быў настойлівы.

— Ну я вас прашу, дзядуля, сядайце.

Прыйшлося паслухацца. Дзядуля сеў, прыхіліў хлопчыка да сябе і спытаў:

— Як жа цябе зваць?

— Юра.

— У якім жа ты класе, хлапчына, вучышся? — зірнуў дзядуля на Юраў партфель.

— У трэцім.

— Малайчына. Старайся, старайся. Я ў твае гады і аднаго класа не скончыў. Толькі і ўмею распісацца. Ды і то навучыўся, калі мне было дваццаць гадоў.

— Дык вы і казак гэтых не чыталі? — Юра дастаў кніжку з партфеля.

— Не. Казкі расказвала мне маці.

— Ой, дзядуля, колькі цікавага вы не ведаеце! — пашкадаваў хлопчык. — Каб жылі блізка ад нас, я і вам чытаў бы... Тату і маме я кожны вечар чытаю.

Дзядуля паглядзеў у акно і сказаў:

— Ну, мне скора выходзіць. Ты куды — у школу ці са школы едзеш?

— У школу.

— Настаўнік ці настаўніца вучыць цябе?

— Настаўніца.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Сядай на маё месца, — устаў дзядуля, — і перадай настаўніцы дзякуй. Скажы: «Ад дзядулі Сцяпана Міхайлавіча».

— Вы ведаеце нашу Вольгу Пятроўну? — здзівіўся Юра і сеў на лаўку.

— Не. Але ты перадай ад мяне дзякуй, прашу цябе! — ужо з прыступкі гукнуў дзядуля.

«А за што перадаваць дзякуй незнаёмай настаўніцы? — пацiснуў плячамі Юра. — Прывітанне і то знаёмым толькі перадаюць, а тут — дзякуй...»

Настаўніца ўвайшла ў клас, і Юра перадаў ёй дзядулеву падзяку. Вольга Пятроўна распытала, дзе і калі гэта было, трошкі захвалявалася і падзякавала вучню за прынесенае добрае слова.

А за што ўсё ж дзякаваў дзядуля настаўніцы? Можа, ты ведаеш?

*(Паводле Алеся Пальчэўскага)*

?! Адкажыце на пытанні, зададзеныя ў канцы апавядання.

Знайдзіце і прачытайце ветлівыя словы і выразы, якія выкарыстоўвалі Юра і дзядуля.

Што можна сказаць пра хлопчыка Юру? Які ён?

Якія словы з прыведзеных ніжэй не падыходзяць для характарыстыкі Юры? Чаму?

Запішыце толькі тыя словы, якія падыходзяць для характарыстыкі Юры:

*добры, чулы, бессардэчны, ветлівы, няўважлівы, выхаваны, спагадлівы.*

*Узор. Юра добры, ...*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**82.** Разгледзьце малюнкі.













?! Што адбываецца ў сітуацыях, адлюстраваных на малюнках? Якія ветлівыя словы трэба ўжыць у кожным выпадку?

Разыграйце кожную сітуацыю ў асобах.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**83.** Сачыце за тым, як чытае дыялог настаўнік.

— ...! Прачынайся, сыночак. Снеданне хутка будзе гатова.

— .... Я зараз, памыюся і хуценька апрануся. Ой, як смачна пахне! ...!

— ...! Снедай, бо ўсё астыне.

— ..., мама.

— Расці здаровым, сыночак.

?! Калі адбываецца гэтая размова? Хто ўдзельнічае ў дыялогу? Якімі ветлівымі словамі можна дапоўніць дыялог?

Прачытайце дыялог. Дапоўніце яго неабходнымі ветлівымі словамі: *добрай раніцы, прыемнага апетыту, дзякуй.*

*прачынайся, снеданне, будзе, гатова, снедай, расці*

**84.** Паслухайце тэкст.

Сёння ты чакаеш гасцей. Не забудзь прыбраць у пакоі і апрануць святочнае адзенне.

Госці стукаюць у дзверы. Хутчэй адчыняй! Сустракай іх ветліва, з усмешкай. Дапамажы гасцям распранацца і запрашай у пакой. Не забудзь пазнаёміць іх з бацькамі.

Старайся, каб гасцям было весела і прыемна. Запрасі іх за стол. Сачы, каб госці не сядзелі перад пустымі талеркамі.

Праводзь гасцей да дзвярэй.

Дапамажы ім апранацца і адчыні дзверы. Не забудзь развітацца.

*(Паводле Аляксандра Дорахава)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Ці прытрымліваецеся вы такіх правіл паводзін, калі да вас прыходзяць госці?

Якія ветлівыя словы будуць ужыты, калі да вас прыйдуць госці?

Прачытайце тэкст. Разыграйце сітуацыі, апісаныя ў ім. Выкарыстайце неабходныя ветлівыя словы.

**85.** Выкарыстайце беларускія ветлівыя словы ў вашым звычайным школьным жыцці.

Пражывіце хаця б адзін дзень з беларускімі ветлівымі словамі. Вітайцеся і развітвайцеся па-беларуску, дзякуйце, выказвайце просьбы, прасіце прабачэння, жадайце прыемнага апетыту, добрай ночы на беларускай мове.

Калі будзеце памыляцца, выпраўляйце адно аднаго.

Паспаборнічайце: вызначце самі, хто лепш за ўсіх справіўся з гэтым заданнем.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# Святы ў нашым жыцці. Дзень нараджэння

**86.** Разгледзьце малюнак. Адкажыце на пытанні.



?! Чаму да дзяўчынкі прыйшлі госці? Якое ў яе свята?
Што прынеслі дзеці сваёй сяброўцы?
Як дзяўчынка сустракае гасцей?
У якое адзенне, святочнае ці будзённае, апрануты дзеці?
Якія ветлівыя словы скажуць сябры дзяўчынцы? Што яна ім адкажа?

**87.** Прачытайце сказ.

**Мой дзень нараджэння чатырнаццатага жніўня.**

?! Скажыце, калі дзень нараджэння ў кожнага з вас.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

З дапамогай настаўніка назавіце дзень і месяц свайго нараджэння па-беларуску.
Спішыце спачатку сказ з кнігі, а пасля запішыце дату свайго нараджэння.

**88.** Разгледзьце табліцу. У ёй змешчаны імёны дзяцей, але прапушчаны першыя літары імёнаў. Якія імёны «зашыфраваны»?






| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | а | н | і | к |
| | о | м | а | |
| | л | а | д | |
| | э | н | я | |
| | а | р | ы | с |
| | л | а | | |
| | а | ц | я | |
| | г | а | р | |






?! Зрабіце ў сшытку такую ж табліцу, як на ўзоры.
Дапішыце ў пустыя клетачкі першыя літары імёнаў дзяцей.
З першых літар, прачытаных зверху ўніз, атрымаецца новае слова.
Як можна назваць дзяцей, чые імёны пералічаны ў табліцы?
Запішыце слова *дружбакі* ў сшытку паводле ўзору.

*дружбакі*

Колькі ў гэтым слове літар і колькі гукаў?
Падзяліце слова на склады. На які склад падае націск?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**89.** Запішыце сказ у сшытку паводле ўзору.

*Данік, Рома, Улад, Жэня, Барыс,*
*Ала, Каця, Ігар — дружбакі.*

Растлумачце напісанне вялікай літары ў словах сказа.
Ці ёсць дружбакі ў вашым класе? Назавіце іх імёны. Якімі іншымі словамі можна назваць дружбакоў?
Запішыце імёны вучняў з вашага класа, якія сябруюць, а пасля імёнаў — слова *дружбакі* ці словы *сябры, таварышы*.
Пішыце імёны з вялікай літары.

**90.** Паслухайце тэкст.

## Дзень нараджэння

У Сярожы быў дзень нараджэння. Яму споўнілася дзесяць год.

Мама з самай раніцы рыхтавала стол. Яна спякла вялікі торт.

Тата выканаў запаветнае Сярожава жаданне. Ён падарыў сыну веласіпед.

У госці да Сярожы прыйшлі сябры — Рыгорка і Міша. Яны прынеслі маленькага пушыстага коціка.

Тата, мама, Сярожа і госці сядзелі за сталом, пілі чай з тортам і жартавалі. Усім было весела.

*(Паводле Уладзіміра Паўлава)*

У каго быў дзень нараджэння? Колькі год споўнілася Сярожу?
Ён старэйшы ці маладзейшы за вас? На колькі год?
Хто сябры Сярожу? Што яны падарылі?
Прачытайце тэкст. Правільна вымаўляйце спалучэнні літар *дж* і *дз*.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Напішыце паводле тэксту, хто з кім сябруе.

*дзень, нараджэння, споўнілася, дзесяць, гадоў, рыхтавала, спякла, жаданне, госці*

**91.** Паслухайце дыялог. Сачыце па кнізе, як чытае дыялог настаўнік.

— Дзяніска, табе падарунак!
— О! Я вельмі люблю падарункі.
— Развязаць пакуначак?
— Калі ласка! Вельмі ж цікава.
— Глядзі, што я табе купіла.
— Машынка! Гэта будзе мая любімая цацка!
— Ой! Я забылася павіншаваць цябе з днём нараджэння! Жадаю табе ўсяго самага лепшага!
— Дзякую табе!

?! У каго дзень нараджэння: у хлопчыка або ў дзяўчынкі? Як завуць імянінніка?
Хто падарыў Дзянісу машынку? Ці спадабалася яна яму? Як вы гэта зразумелі?
Прачытайце дыялог па асобах. Перадавайце з дапамогай інтанацыі пачуцці дзяцей: таго, хто дорыць падарунак, і таго, хто яго прымае.

**92.** Прачытайце верш школьніцы Галі Жушмы, які быў надрукаваны ў часопісе «Вясёлка».

### Алоўкі

Дзень нараджэння
ў маёй сяброўкі.
Падарыла Тані
новыя алоўкі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Хай яна малюе
ніvы, пушчы, горы
і карабель прыгожы —
у вялікім моры.

Што падарыла дзяўчынка сваёй сяброўцы?
Як завуць сяброўку?
Што Галя прапанавала сяброўцы намаляваць?
Вазьміце каляровыя алоўкі і намалюйце што-небудзь з пералічанага ў вершы.

*сяброўкі, алоўкі, пушчы, горы*

**93.** Паслухайце тэкст.

Цябе запрасілі на дзень нараджэння. Што падарыць сябру? Прапаную табе некалькі парад.

Падарунак трэба рыхтаваць па сакрэце.

Успомні, што любіць твой сябар, аб якой рэчы ён даўно марыць.

Не старайся патраціць шмат грошай. Цана падарунка вымяраецца не ў грошах. Лепш падары таварышу марку або дыск, самаробны альбом або пенал. А яшчэ лепш — кнігу ці малюнак.

Маме будзе вельмі прыемна атрымаць у падарунак зробленую тваімі рукамі рэч: рамку, палічку, шкатулку або вышытую сурвэтку.

*(Паводле Аляксандра Дорахава)*

П а р а́ д а — павучанне, як дзейнічаць. *Рус.*: совет.

С у р в э́ т к а — невялікі кавалак тканіны або паперы, якім засцерагаюць вопратку ад бруду ў час яды і г. д. *Рус.*: салфетка.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Як вы разумееце выраз: «Цана падарунка вымяраецца не ў грошах»? А ў чым?

Што лепш падарыць сябру?

Якім падарункам можна парадаваць маму?

Ці дарэць іншым тое, што раней падарылі табе? Чаму?

Знайдзіце ў тэксце сказ, у канцы якога стаіць пытальнік. З якой інтанацыяй яго трэба чытаць?

Які знак прыпынку стаіць у канцы ўсіх астатніх сказаў?

Ці звязаны ўсе гэтыя сказы паміж сабой па сэнсе?

**Некалькі сказаў, якія звязаны паміж сабой сэнсам, інтанацыяй, называюцца т э к с т а м .**

**94.** Раскажыце, якія падарункі вы атрымалі на свой апошні дзень нараджэння.

Што вам падарылі бацькі? Сябры?

Ці запрашалі вы гасцей на свой дзень нараджэння?

Колькі гадоў вам споўнілася?

Якія падарункі вы дарылі на дзень нараджэння сваёй маці, сябрам?

Адкажыце на пытанні, сачыце за правільнасцю сваёй беларускай мовы.

**95.** Паслухайце тэкст.

### У Лены свята

У Лены дзень нараджэння. Яна дапамагае маці накрыць на стол. Дзяўчынка ставіць на стол кубачкі са спадачкамі, вазачкі з варэннем, раскладвае чайныя лыжачкі. У цэнтры стала на прыгожым блюдзе стаіць торт. Вакол яго — вазы з садавінай, піражнымі, цукеркамі. Да Лены прыйдуць у госці сябры. Трэба іх добра пачаставаць.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



?! Якое свята ў Лены?
Як яна рыхтуецца да прыходу гасцей?
Чым Лена будзе частаваць гасцей?
Разгледзьце малюнак. Прачытайце сказы. Ці з'яўляюцца гэтыя сказы тэкстам? Чаму?
Раскажыце, як Лена рыхтуецца да прыходу гасцей.

**96.** Прачытайце скорагаворку.

**Добры госць**

Добры госць
есць, што ёсць.
У благога свая чэсць:
што ёсць — не есць.

*(Васіль Вітка)*

Б л а г í — дрэнны. *Рус.*: плохой.

?! Якое правіла паводзін у гасцях закладзена ў гэтай скорагаворцы?
Як паводзіць сябе добры госць, а як — дрэнны?
Як вы паводзіце сябе ў гасцях?
Навучыцеся чытаць скорагаворку хутка.

*госць, есць, благога, чэсць*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**97.** Паслухайце тэкст.

## Сюрпрыз

Летам Іна прачынаецца раненька. Памые халоднай вадою твар і яшчэ да сняданку выбягае ў скверык. Там хто-небудзь з сябровак ужо чакае яе. Вось і сёння нешта доўга загулялася з раніцы.

Дзядуля падышоў да акна, паглядзеў. У скверыку дзяўчынак не відаць. Дзе ж Іна? Бабуля недзе ў магазіне.

Тут якраз і пастукала ўнучка. Да званка яшчэ не можа дацягнуцца, малая.

— Ведаеш, дзядуля, мяне Літа запрасіла на дзень нараджэння!

— Вельмі добра!

— Лену, Любу і Валю таксама запрасіла. Яшчэ ўчора. Яны, дзядуля, падарункі купілі. А з чым я пайду?

— Давай разам падумаем пра падарункі, Іначка.

— Ведаеш, я прыдумала! Куплю каробку цукерак, кніжку з малюнкамі і напішу на ёй, што гэта Ліце ад мяне. У бабулі вазьму ружовую стужку і завяжу прыгожым банцікам. Ага, яшчэ падару ёй аксамітнага пеўніка, іх у мяне аж два.

— Добра, — сказаў дзед, — але, ведаеш, занясі Ліце не аксамітнага, а жывога пеўніка. Схаваем яго ў вялікую прыгожую каробку...

У дзесяць гадзін па Іну забеглі сяброўкі Валя і Лена.

— Хутчэй, а то спознімся!

Бабуля ледзь угаварыла іх разам паснедаць, бо запрасілі ж іх на адзінаццаць, а цяпер толькі дзесяць гадзін.

Якое ўжо там снеданне, калі ўпершыню ў жыцці дзяўчынкі самастойна ішлі на дзень нараджэння сяброўкі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Бабуля сама аж да дзвярэй Літы несла каробку з пеўнікам. Валя і Лена вельмі цікавіліся, што ў каробцы, але Іна не сказала. Яна дала дзеду слова, што да апошняй хвіліны не адкрые сакрэту.

У хаце кожная з сяброўак паднесла падарункі імянінніцы. Літа брала іх і, не спяшаючыся, паважна дзякавала гасцям. Іна паставіла вялікую прыгожую каробку на крэсла. Усе, хто быў у пакоі, з цікавасцю паглядалі на яе.

— А што тут? — запытала Літа.

— Сюрпрыз, — таямніча сказала Іна, як вучыў яе дзед.

— Што там за сюрпрыз? — падышла Ліцына мама.

— Трымай, Літа! Гэта ад мяне і майго дзядулі, — сказала Іна.

Літа хуценька развязала каляровыя стужкі і зняла вечка. З каробкі, усім на здзіўленне, захлопаўшы крыламі, выскачыў прыгожы пеўнік. Ён узляцеў на стол, крыху





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

прыгнуўся, выцягнуў залацістую шыю, узмахнуў крыламі і закрычаў:

— Ку-ка-рэ-ку-у-у!

Гэта, мабыць, азначала:

— З днём нараджэння-а!

З усіх падарункаў Ліце найбольш спадабаўся пеўнік.

Іна вясёлая вярнулася дахаты. Яна моцна абняла дзядулю і сказала:

— Наш падарунак быў самы лепшы!

— Чаму наш? Ён жа твой.

— І твой, і мой, — папраўіла ўнучка. — А цётка Ніна сказала, што ніхто ніколі не прыносіў такіх цікавых падарункаў. Гэта быў сапраўдны сюрпрыз.

*(Уладзімір Мяжэвіч)*

**А к с а м і́ т н ы** — выраблены з шаўковай тканіны, якая мае мяккі, гладкі і густы ворс.

**В е́ ч к а** — верхняя частка якой-небудзь пасудзіны, скрынкі, каробкі, якою яе закрываюць; накрыўка. *Рус.*: крышка.

**С ю р п р ы́ з** — нечаканасць, нечаканы падарунак.

?! Як завуць дзяўчынку, у якой быў дзень нараджэння?
Каго яна запрасіла на свой дзень нараджэння?
Што хацела падарыць Іна? Што ёй параіў дзядуля?
Ці спадабаўся Ліце падарунак Іны?
Чаму апавяданне мае назву «Сюрпрыз»? Звычайны ці незвычайны падарунак зрабіла Іна сваёй сяброўцы?

Знайдзіце і прачытайце тую частку апавядання, да якой ёсць ілюстрацыя.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**98.** Прачытайце сказы.

*Чалавек без сябра — што ежа без солі.*

*Не той сябар, хто мёдам мажа,*
*а той, хто праўду кажа.*

*Сябар пазнаецца ў бядзе.*

Як вы разумееце сэнс кожнай з прыказак?
Ці ёсць у вас сябры?
Спішыце правільна прыказкі ў сшыткі паводле ўзору.
*без сябра, без солі, праўду, у бядзе*

**99.** Паслухайце тэкст.

Прыемна, калі людзі помняць твой дзень нараджэння, віншуюць цябе.

А ці помніш ты дні нараджэння сваіх родных і блізкіх?

Колькі чалавек у сям'і — столькі і дзён нараджэння. У гэты дзень твая ўвага дарагая кожнаму.

*(Паводле публікацыі часопіса «Вясёлка»)*

Ці з'яўляюцца гэтыя сказы тэкстам? Чаму?
Знайдзіце сказ, у канцы якога стаіць пытальнік. Адкажыце на пытанне гэтага сказа.
Калі дзень нараджэння вашых бацькоў? Братоў і сясцёр? Дзядуль і бабуль?
Як вы звычайна віншуеце сваіх родных з днём нараджэння?

**100.** Уявіце, што ў аднаго з вас сёння дзень нараджэння. Усе астатнія віншуюць таварыша з днём нараджэння, дораць падарункі.

Разыграйце гэтую сітуацыю па асобах.

Мяняйцеся ролямі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**101.** Прачытайце віншавальную паштоўку.




?! Якое свята ў Святланы? Хто яе віншуе? Якім чынам Тоня гэта робіць?

На якія святы дасылаюць віншавальныя паштоўкі? Каму іх шлюць?

Ці пасылаюць віншавальныя паштоўкі незнаёмым людзям?

Ці атрымлівалі вы калі-небудзь віншавальную паштоўку? Калі так, то з якім святам вас віншавалі?

Спішыце тэкст віншавальнай паштоўкі ў сшытку. Замяніце пры гэтым імя *Святлана* імем свайго сябра або сяброўкі, а імя *Тоня* — сваім імем.

Намалюйце ў сшытках побач з віншаваннем кветку.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



# Вусная народная творчасць



**102.** Паслухайце тэкст.

Праз родную мову мы пазнаём мацярынскую ласку, шчырую дабрыню і жыццё наогул.

Кожнаму чалавеку трэба заўсёды карыстацца роднай мовай.

Вывучайце беларускую літаратуру, і вы пазнаеце свой народ, яго гісторыю, яго багатую вусную творчасць.

Душэўнай шчырасцю і палымянай цеплынёй сэрца напоўнена родная беларуская мова.

*(Паводле Якуба Коласа)*

?! З якой парадай звяртаецца да чытачоў адзін з самых знакамітых беларускіх пісьменнікаў Якуб Колас?
Навошта трэба вывучаць родную мову і літаратуру?
Вызначце колькасць сказаў у гэтым тэксце. Які знак прыпынку стаіць у канцы кожнага сказа?

**103.** Паслухайце тэкст.

Ёсць апавяданні, казкі, легенды, вершы, прыказкі, загадкі, песні, якія стварыў народ.

Народную творчасць інакш называюць фальклорам.

Народную творчасць называюць вуснай, таму што творы не запісваліся, а перадаваліся праз вусную мову ад аднаго чалавека да іншага. Напрыклад, бабуля рас-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

казвала ўнучцы казку, а тая, калі вырастала, расказвала гэтую казку сваім дзецям, унукам.

У вуснай народнай творчасці пераважалі творы, невялікія па памерах — прыказкі, прымаўкі, пацешкі, скорагаворкі, загадкі, заклічкі, песні і іншыя творы.

?! Што такое фальклор?
Чаму народная творчасць называецца вуснай?
Якія творы адносяцца да вуснай народнай творчасці? Хто іх стварыў?
Ці з'яўляюцца сказы, якія вы паслухалі, тэкстам?
Які знак прыпынку стаіць у канцы ўсіх сказаў?

## ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ

**Пры́казкі і пры́маўкі** — кароткія народныя выслоўі павучальнага зместу.

**104.** Прачытайце прыказкі.

Усюды добра, а дома лепей.
На яду мастак, а да працы сяк-так.
Што летам народзіцца, тое зімой спатрэбіцца.

?! Растлумачце з дапамогай настаўніка значэнне кожнай прыказкі.
Якая тэма ўсіх гэтых прыказак?
Ці ведаеце вы іншыя прыказкі на гэтую ж тэму?
Ці з'яўляюцца гэтыя сказы тэкстам? Чаму?

**105.** Прачытайце прыказку і прымаўку.

*Прыгожы той, хто сочыць за сабой.*
*Добраму чалавеку жыццё ў радасць.*

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ці аднолькавая тэма прыказкі і прымаўкі, якія вы прачыталі? У якім з выслоўяў гаворыцца пра неабходнасць сачыць за сваім знешнім выглядам?
Растлумачце з дапамогай настаўніка значэнне прыказкі — яна першая па ліку.

Спішыце народныя выслоўі ў сшытак паводле ўзору.

**106.** Прачытайце рускія прыказкі.

Не имей сто рублей, а имей сто друзей.
С кем поведёшься, от того и наберёшься.
Поспешишь — людей насмешишь.

Паслухайце гэтыя ж прыказкі на беларускай мове.

З кім пазнаешся, такім і станешся.
Спяшыць — людзей смяшыць.
Лепш сто сяброў, чым сто рублёў.

Падбярыце да кожнай рускай прыказкі адпаведную ёй беларускую.
З дапамогай настаўніка растлумачце значэнне кожнай прыказкі.
Вывучыце адну пару прыказак на памяць.
Запішыце па памяці беларускую прыказку. Праверце сябе па кнізе.

*з кім, пазнаешся, станешся, спяшыць, людзей, смяшыць, сяброў, рублёў*

**107.** Разгледзьце малюнак.

— Мама, калі мы пойдзем гуляць?
— Калі я закончу прасаваць.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



— Хутчэй заканчвай, калі ласка!
— ....

?! Што робіць маці?
Аб чым папрасіў яе хлопчык?
Маці адказала яму прыказкай з папярэдняга практыкавання 106. Знайдзіце гэтую прыказку. У якіх выпадках яна выкарыстоўваецца?

**108.** Адкажыце на пытанні так, каб атрымаліся прыказкі і прымаўкі.

Ці баіцца справа майстра?
Ці даражэйшая праўда за золата?
Ці ўсім багата татава хата?
Што корміць: рукі ці печ?

*Узор.*

— *Што корміць: рукі ці печ?*
— *Кормяць рукі, а не печ.*

?! Растлумачце значэнне кожнай прымаўкі і прыказкі.
Ці згодны вы з тымі меркаваннямі, якія ў іх выказваюцца?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**109.** Паслухайце дыялог. Якая сітуацыя ў ім пададзена?

— Чаго ты, дзяўчынка, плачаш?
— Я заблудзіла і не магу зайсці дамоў.
— А дзе ты жывеш?
— На вуліцы Мележа.
— Гэта ж побач, за рагом. Толькі асцярожненька ідзі.
— Вялікі вам дзякуй.
— Запомні прымаўку і прыказку: «Язык да Кіева давядзе», «Хто пытае, той не блудзіць».

*(З кнігі «Сцяжынка»)*

Хто ўдзельнічае ў дыялогу?
Якія ветлівыя словы выкарыстала дзяўчынка?
Растлумачце значэнне народных выслоўяў.

Прачытайце дыялог па асобах.

Выпішыце з тэксту прымаўку і прыказку.

**110.** Прачытайце народныя выказванні і паслухайце іх тлумачэнне.

Неабходнае, карыснае ніколі не зашкодзіць.
Кашу маслам не сапсуеш.
Свае недахопы ці станоўчыя рысы дзеці пераймаюць ад бацькоў.
Яблык ад яблыні недалёка падае.
Усё ў жыцці патрабуе намаганняў.
І да грыба трэба нагнуцца.

Ці згодны вы з меркаваннямі, якія выказаны ў гэтых народных выслоўях?

Спішыце прымаўкі ў сшытак.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**111.** Паслухайце дыялог.

— Мама, ты казала, што мы пойдзем гуляць.
— Пойдзем. А ты склала свае цацкі, дачушка?
— Я потым складу.
— Не. Складзі цацкі, а потым пойдзем: ....

?! Каб закончыць дыялог, падбярыце з народных выказванняў, пададзеных ніжэй, тое, якое падыходзіць:

Сем разоў адмер, адзін раз адрэж.
Адклад не ідзе ў лад.
Трымай язык на прывязі.

Прачытайце дыялог па асобах разам з прымаўкай.

**112.** Паслухайце тэкст аб паходжанні адной з прыказак.

Адзін пасынак прывык з маленства называць айчыма па імені — Кузьмой. А калі ён падрос, не пакідаў сваёй прывычкі. Але аднойчы, калі яны везлі з айчымам на вазах снапы пшаніцы, пасынак неяк узʼехаў на ўзгорак. Потым ён трапіў пад воз, які перакуліўся на яго. Пасынак клікаў на дапамогу свайго Кузьму, які ехаў наперадзе, але Кузьма не адгукнуўся і працягваў ехаць. Пасынак зразумеў няўвагу айчыма і пачаў крычаць: «Тата! Тата! Памажы мне вылезці». Айчым зараз жа спыніўся і вызваліў пасынка, але той, калі прыехаў дамоў, расказаў пра гэты выпадак так: «На вяку ўсяго нажывеш — і Кузьму татам назавеш».

*(Паводле Івана Насовіча)*

А й ч ы́ м — няродны бацька.
П а́ с ы н а к — няродны сын для мужа ці жонкі ў сямʼі.

?! Знайдзіце ў тэксце прыказку. Як можна растлумачыць яе значэнне зараз?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**113.** Прачытайце сказы.

Хто дбае, той і мае.
Госць мала гасцюе, ды многа бачыць.
Едзеш на дзень — бяры хлеба на тыдзень.
На хаценне ёсць цярпенне.
Не можаш памагчы, дык лепей памаўчы.

Растлумачце значэнне кожнага з гэтых народных выказванняў. Прыдумайце сітуацыі, у якіх гэтыя прымаўкі і прыказкі будуць дарэчы.

*госць, гасцюе, многа, бачыць, едзеш, дзень, тыдзень, хаценне, цярпенне, дапамагчы, памаўчы*

## ПАЦЕШКІ

**Пацéшка** — невялікі верш, якім забаўляюць дзіця; забаўлянка.

**114.** Паслухайце пацешку.

Кую, кую ножку,
паеду ў дарожку.
Дарожка крывая,
кабылка сляпая.
Еду, еду,
ніяк не даеду.

Якімі дзеяннямі можа суправаджацца гэтая забаўлянка?
Паслухайце забаўлянку яшчэ раз і сачыце, якія дзеянні будзе выконваць настаўніца з лялькай.
Раскажыце і пакажыце самі гэтую пацешку.

*ножку, дарожку, сляпая*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**115.** Паслухайце пацешку.

Лады-лады-ладкі.
— Дзе былі?
— У бабкі!
— Што елі?
— Кашку!
— Што пілі?
— Бражку!
Кашкі паелі,
бражкі папілі,
на галоўку селі,
пырх — і паляцелі.

Раскажыце такую ж забаўлянку па-руску.
Прачытайце забаўлянку на беларускай мове. Суправаджайце чытанне адпаведнымі дзеяннямі.
Ці расказвалі вам, калі вы былі зусім маленькімі, забаўлянкі? Спытайцеся ў вашых бацькоў.

*ладкі, бабкі, бражку, галоўку*

**116.** Паслухайце пацешку.

— Мышка, мышка, дзе была?
— Была ў пана караля.
— Што рабіла?
— Лыжкі мыла.
— А што далі?
— Кусок сала.
— Дзе паклала?
— Пад лаўкаю.
— Чым накрыла?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Халяўкаю.
— Дзе падзела?
— Кошка з’ела.

Х а л я́ ў к а — верхняя частка ботаў. *Рус.*: голенище.

Развучыце пацешку з настаўнікам на памяць.
Раскажыце яе па асобах.

*лыжкі, з’ела*

**117.** Зладзьце невялікі спектакль. Разыграйце пацешку.

Дзеючыя асобы:
маці-мыш, дачка-мышка, кот.

(Маці-мыш ганяецца за дачкой-мышкай, якая бегае вакол стала. У куце сядзіць кот.)

М а ц і: Мышка, мышка, дзе была?

Д а ч к а (бегае): Была ў пана караля.

М а ц і: Што рабіла?

Д а ч к а (бярэ са стала лыжку і паказвае): Лыжкі мыла.

М а ц і: А што далі?

Д а ч к а: Кусок сала. (Паказвае рукамі, які вялікі кусок сала.)

М а ц і: Дзе паклала?

Д а ч к а: Пад лаўкаю. (Глядзіць пад лаўку.)

М а ц і: Чым накрыла? (Таксама глядзіць пад лаўку, але нічога пад ёю не знаходзіць.)

Д а ч к а: Халяўкаю. (Шукае сала пад лаўкаю разам з маці.)

М а ц і (грозна): Дзе падзела?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

(З’яўляецца кот. Убачыўшы мышак, ён пачынае ганяцца за імі.

Не дагнаўшы мышак, кот сядае на падлогу, дастае з торбы кавалак сала, пачынае есці.

Мышкі моўчкі пазіраюць на яго.

Кот, з’еўшы сала, пацягваецца, кажа «мяў» і засынае на падлозе.)

**118.** Паслухайце верш.

## Зайчаняткі

— Дзе былі вы, зайчанятkі?
— Загаралі каля градкі.
— А пасля куды прапалі?
— Маме дома памагалі.
Мылі міскі, мылі лыжкі,
акуратна склалі кніжкі.
— Ну а што пасля рабілі?
— Да мядзведзіка хадзілі.
Пазаўчора яму дзед
падарыў веласіпед.
І цяпер мы на палянцы
разам вучымся катацца.
Хочаш, з намі павучыся.
— Толькі ты, глядзі, не біся!



*(Алесь Бадак)*

Ці падобны гэты верш на забаўлянку? Чым ён падобны? Ці можна назваць яго народным? Чаму? Хто яго аўтар?

Прачытайце тую частку верша, да якой ёсць ілюстрацыя.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**119.** Паслухайце верш.

Мурка мышку ўпалявала.
Гаспадыню частавала.
За малачко, за смятанку
мышку прынесла ўранку
і паклала...
— На ганку?
— Не!
— На парозе?
— Не!
— На падлозе?
— Не!
— Няўжо на стале?
— Але...
Ой-ёй-ёй!

*(Ганна Іванова)*

?! Навучыцеся чытаць гэты верш-забаўлянку па асобах. Удзельнічаюць тры чытачы: адзін чытае першыя пяць радкоў і самыя апошнія словы, другі задае пытанні, трэці адказвае.

**120.** Прачытайце забаўлянку.

**Ад самага ранку**

Ад самага ранку
нічога не еў,
хлеба ўзяў буханку,
намачыць хацеў.
Як на тое дабро —
не ўлезла ў вядро.
Дык я ўсухамя —
ледзь дажыў паўдня.

*(Васіль Вітка)*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Усухамя́** — усухамятку.

Навучыцеся чытаць забаўлянку хутка, як скорагаворку, і выразна.

## СКОРАГАВОРКІ

**121.** Прачытайце сказы.

**На дварах без пары таўкуць мак камары.**
**Елі барбарыскі Пракоп і Барыска.**
**Касі каса, пакуль раса.**

У якім тэмпе расказваюцца ці чытаюцца скорагаворкі — хуткім ці павольным?
Паспрабуйце паўтарыць кожную са скорагаворак за настаўнікам хутка. Ці добра ў вас атрымліваецца?
Якія гукі часцей паўтараюцца ў першых дзвюх скорагаворках?
Якія гукі часта паўтараюцца ў трэцяй скорагаворцы?
Якія словы ў другой скорагаворцы напісаны з вялікай літары? Чаму?

Спішыце другую скорагаворку. Падкрэсліце ў ёй літары, якія паўтараюцца.

**122.** Прачытайце скорагаворку.

**Як Якімка, так і Хімка,**
**а як Хімка, так і Якімка.**

Якія гукі часцей паўтараюцца ў гэтай скорагаворцы?
Прачытайце яе спачатку павольна, а пасля хутка.
Якія словы напісаны з вялікай літары? Чаму?

Спішыце скорагаворку ў сшытку.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**123.** Ці ведаеце вы скорагаворкі на рускай мове? Раскажыце іх хутка. Паспаборнічайце: хто лепш расказвае скорагаворкі.

**124.** Прачытайце скорагаворку.

Калі б мог расці тут мох,
я надраць бы моху змог.

*(Васіль Рагаўцоў)*

?! Народная ці аўтарская гэта скорагаворка?
Якія гукі ў ёй паўтараюцца? Навучыцеся чытаць скорагаворку хутка.

**125.** Прачытайце скорагаворку.

Сеня
сена
косіць,
Сева
сена
носіць...
Носіць
сена
Сева,
косіць
сена
Сеня.

*(Уладзімір Мацвеенка)*

?! Хто косіць сена? А хто носіць?
Паспрабуйце прачытаць скорагаворку хутка. Якія гукі ў ёй паўтараюцца? Якія словы вы заўсёды напішаце з вялікай літары?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**126.** Прачытайце верш-скорагаворку.

Запрашаў
к сабе сурок
дзвюх сябровак,
дзвюх сарок.
Частаваў
сурок сарок,
падаваў
салат, сырок...
Расказаў
сябрам сурок:
— Знік салат
і знік сырок,
зніклі й белабокі,
хітрыя сарокі.
Вось і даў сурок зарок —
Не вадзіць к сабе сарок.

*(Уладзімір Мацвеенка)*

З а р о́ к — клятвеннае абяцанне не рабіць чаго-небудзь.

Прачытайце імя і прозвішча аўтара дзвюх апошніх скорагаворак.
Назавіце гукі, якія часцей паўтараюцца ў скорагаворцы.
Прачытайце скорагаворку спачатку павольна, а пасля ў хуткім тэмпе.

**127.** Вывучыце адну са скорагаворак на памяць. Раскажыце яе дома родным ці ў школе выхавальнікам.

Ці зразумелі яны вас?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ЗАГАДКІ

**128.** Паслухайце загадкі.



Залатая бочачка
зранку пакацілася —
ні стукату, ні грукату,
не ўпала, не разбілася,
а як накрасавалася —
за гару схавалася.



Пакаціўся клубок —
і рассыпаўся гарох.
А як стала світаць —
не было чаго збіраць.

Адгадайце загадкі з дапамогай малюнкаў.
З чым у загадках параўноўваецца сонца? А з чым месяц і зоркі?

**129.** Прачытайце загадкі.



*Сівыя бараны ў небе плаваюць.*

*Румяны Пілін да палкі прыліп.*

*Стаіць у лазе на адной назе.*



Колькі сказаў вы прачыталі? Ці можна назваць гэтыя сказы тэкстам? Чаму?



Спішыце загадкі паводле ўзору. Намалюйце адгадкі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**130.** Прачытайце словы.

Дождж, вецер, вясёлка, сонца, аловак, гадзіннік.

Ці ўсе словы вам зразумелыя? Як па-руску будзе *вясёлка, аловак, гадзіннік*?

Назавіце ў прачытаных словах літары галосных гукаў.

Падзяліце ўсе словы на склады. У якім слове толькі адзін склад? Ці можна гэтае слова падзяліць пры пераносе?

*дождж, гадзіннік*

**131.** Паслухайце загадкі.

Ад нябёсаў да зямлі сем сцяжынак праляглі.
Ляжыць паленца, а ў сярэдзіне сэрца.
І дзень ішоў, і ноч ішоў,
а з месца нават не сышоў.
Круглéнькае, бялéнькае, усяму свету мілéнькае.
Ляціць, а не птушка, вые, а не звер.
І тонкі, і доўгі, а з травы не відаць.

Адгадайце загадкі з дапамогай слоў з практыкавання 130.

Спішыце дзве загадкі. Запішыце і намалюйце адгадкі.

**132.** Прачытайце загадкі.

Чубатая, стракатая, лапкамі заграбае, дзетак склікае.
У вадзе купалася, сухой засталася.
Кульгавая цётачка па ваду пайшла.
Хвост з узорамі, боты са шпорамі, раніцою ўстае, гучна песенькі пяе.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Стракáтая — з рознакаляровым апярэннем. *Рус.*: пёстрая.

Пра якіх свойскіх птушак гэтыя загадкі? Адгадайце з дапамогай малюнкаў.

Спішыце апошнюю загадку, падзяляючы словы на склады. Пастаўце ў словах націск.

Запішыце слова-адгадку, таксама падзяліце яго на склады і пастаўце націск.

**Літара *о* ў беларускай мове заўсёды стаіць пад націскам.**

**133.** Паслухайце загадкі.

Не куст, а з лісточкамі, не кашуля, а сшыта.
Без крылаў, а ляціць, без языка, а гаворыць.
Пяцёра валоў адной сахой аруць.
Не піў, не еў, а крычыць, як ашалеў.

Кашýля — адзенне з лёгкай тканіны на верхнюю частку цела. *Рус.*: рубашка.

Сахá — сельскагаспадарчая прылада для ворыва.

Адгадайце загадкі, якія звязаны з вучэннем, школай. З чым у трэцяй загадцы параўноўваецца працэс пісьма?

Спішыце апошнія дзве загадкі. Вызначце колькасць слоў у гэтых сказах.











Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**134.** Прачытайце верш-загадку.

### У кожным кутку

У кожным кутку
ў хаце па катку.
Кожны сядзіць,
на траіх глядзіць.
Колькі ж куткоў
і колькі каткоў?

*(Васіль Вітка)*

Адкажыце на пытанне верша-загадкі.

Запішыце словы з літарай **о**. Пастаўце ў гэтых словах націск.

**135.** Пагуляйце ў гульню «Загадай-адгадай». Паспрабуйце сябе ў якасці складальнікаў загадак. Складзіце загадкі пра знаёмыя прадметы школьнага побыту і загадайце іх адзін аднаму.

*Узор. Ён бывае ў клетачку ці ў лінейку, мае старонкі, у ім выконваюць заданні вучні на ўроках і дома. Што гэта? (Сшытак.)*

**136.** Паслухайце вершы-загадкі беларускіх паэтаў. Заканчвайце іх словам-адгадкай.

З цёмнай хмары наўскасяк
скочыў на зямлю басяк.
І пусціўся басанож.
Вы яго пазналі? ... (дождж)

*(Васіль Вітка)*

Па цвічку тук-ток
б’е жалезны ... (малаток).

*(Еўдакія Лось)*

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Цёплым сонейкам сагрэта,
прыйшло радаснае ... (лета).

*(Еўдакія Лось)*

Тут лапоча, там стракоча,
усе навіны ведаць хоча.
Гэта птушка белабока —
балбатлівая ... (сарока).

*(Рыгор Бохан)*

Каб вы зналі, як я рад:
мне купілі ... (самакат).

*(Алесь Бачыла)*

**137.** Паслухайце загадкі.



Адна я ў лесе з белаю карой.
Паю вас сокам веснавой парой.

*(Васіль Жуковіч)*



І ў сто гадоў я малады.
Маё насенне — жалуды.

*(Васіль Жуковіч)*



Узбагачаюся я летам
не пышным — ледзь прыкметным цветам.
Але як толькі зацвіту,
дык пчолы чуюць за вярсту.

*(Васіль Жуковіч)*

Я засяваю дол ігліцай,
спрадвеку слаўлюся жывіцай.

*(Васіль Жуковіч)*





Нішто не ляцела,
нішто не спужала,
а ўся затрымцела,
а ўся задрыжала.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Ці зразумелі вы, пра якія дрэвы складзены гэтыя загадкі? Запішыце самастойна словы-адгадкі. Пастаўце ў іх націск. Назавіце колькасць складоў. Якое слова нельга падзяліць пры пераносе? Чаму?
Складзіце загадку самі пра якое-небудзь дрэва, напрыклад, пра елку.

**138.** Прачытайце загадкі.

1. Прыйшла чорна маці, усіх паклала спаці.
2. Хоць зубоў не мае, а балюча кусае.
3. Вісіць — зялёны, ляціць — чырвоны, ляжыць — чорны.





?! Адгадайце загадкі.
Перамалюйце крыжаванку ў сшытку. Запішыце словы-адгадкі пад адпаведнымі нумарамі.
Прачытайце і адгадайце чацвёртую загадку.




4. Паміж двух сваціл пасярэдзіне адзін.

Знайдзіце слова-адгадку ў крыжаванцы.

*прыйшла, чорна, зубоў, балюча, зялёны, жоўты, сваціл*

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ЗАКЛІЧКІ

**За́клічка, заклі ка́нне** — гэта невялікі вершык, у якім звяртаюцца да дожджыка, вясны, сонейка з просьбай прыйсці, выглянуць і г. д.

**139.** Паслухайце заклічку.

Вясновыя вочкі,
ідзі, зіма, прочкі.
Вясна ідзе полем
з кветкамі ў прыполе.

**Прыпо́л** — ніжні пярэдні край сукенкі, кашулі.

Разгледзьце малюнак.
Якую пару года праганяюць у заклічцы? Якую чакаюць, клічуць? Калі дарэчы звяртацца з гэтай заклічкай?





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прачытайце самі заклічку, вылучаючы голасам націскныя склады.
Колькі сказаў у заклічцы? Па колькі слоў у кожным сказе?
Як вы разумееце другі сказ заклічкі?

**140.** Прачытайце заклічку.

Дождж**ы**к, дождж**ы**к, сып**а**ні,
сп**ё**ку з п**о**ля праган**і**!
**Я** пад л**і**пкай пасядж**у**,
на л**і**сточкі паглядж**у**.

Што клічуць у гэтым вершы? Ці добра, калі доўга няма дажджу? Чаму?

Спішыце заклічку ў сшытак. Пастаўце ў словах націск.
Якія галосныя гукі ў беларускай мове вымаўляюцца толькі пад націскам?

**141.** Прачытайце заклічку.

Дожджык, дожджык, лі
аж па ўсёй зямлі!

*(Ганна Іванова)*

Вывучыце заклічку на памяць.
Успомніце яе, калі летам пойдзе доўгачаканы дождж.

*па ўсёй*

**142.** Прачытайце заклічку.

Свяці, свяці, сонейка,
каб нам было цёпленька.
Ай, люлі-люлі,
люленькі-люлі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Калі клічуць сонейка? Уявіце, што ўжо цэлы тыдзень лье дождж, людзі стаміліся ад яго і хочуць, каб хутчэй выглянула сонейка. Прачытайце заклічку з такімі пачуццямі.

*свяці*

**143.** Напішыце слова *заклічка* і тлумачэнне яго значэння. Пастаўце націск. Назавіце галосныя і зычныя гукі і літары ў гэтым слове. Колькі ў ім складоў? Па чым вы гэта вызначылі?

## ЛІЧЫЛКІ

**Л і ч ы́ л к а** — невялікі вершык, з дапамогай якога пералічваюцца, напрыклад, перад пачаткам гульні, каб выбраць вядучага і г. д.

**144.** Прачытайце лічылку.

Бег сабака цераз мост,
чатыры лапы, пяты хвост.

*(Васіль Вітка)*

Вывучыце лічылку. Пералічыцеся з яе дапамогай.
Назавіце спачатку толькі галосныя гукі ў словах лічылкі, а пасля — толькі зычныя. Якія гукі лягчэй праспяваць: галосныя ці зычныя?

*бег, цераз, чатыры*

**145.** Паслухайце лічылку.

Кацілася торба
з вялікага горба.
А ў той торбе
хлеб, паляндвіца.
З кім жадаеш
ты дзяліцца?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



?! Разгледзьце малюнак. Што робяць дзеці?
З якой мэтай расказваюць лічылкі? Калі яны выкарыстоўваюцца?
Перад якімі гульнямі патрэбна пералічвацца?
Паслухайце, як настаўнік пералічыць вас з дапамогай гэтай лічылкі. Той, на каго выпала апошняе слова, чытае лічылку.

**146.** Паслухайце лічылку.

**Ліска курачак лічыла**

— Раз,
два,
тры,
чатыры, —
ліска курачак лічыла, —
пяць,
шэсць,
сем,
восем...
Толькі пер'е засталося.

*(Пятро Сушко)*

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Пералічыцеся з дапамогай гэтай лічылкі.

**147.** Прачытайце лічылку.

Раз, два, тры, чатыры
кошку грамаце вучылі:
не чытаць, не пісаць,
а за мышкамі скакаць.

*(Васіль Вітка)*

?! Вывучыце лічылку на памяць. Навучыцеся пералічвацца з яе дапамогай.

**148.** Успомніце лічылкі на рускай мове. Пералічыцеся з іх дапамогай. Правядзіце спаборніцтва: хто лепш расказвае лічылкі?

**149.** Паслухайце лічылку. Запомніце імёны, якія ў ёй узгадваюцца.

**Лічылка**

Ля Яўгена села Лена.
Ля Генадзя села Ядзя.
Каля Зосі — два Антосі.
Каля Надзі — два Аркадзі.
Каля Янкі — тры Святланкі.
Каля Сашы — тры Наташы.
Колькі тут дзяўчат усіх?
Колькі хлопчыкаў ля іх?
Хочаш ведаць — не сядзі,
сам цяпер лічыць ідзі!

*(Нічыпар Парукаў)*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Адкажыце на пытанні лічылкі. Назавіце імёны дзяцей. Навучыцеся чытаць яе з інтанацыяй пералічэння. Пералічыцеся з дапамогай гэтай лічылкі.

Якія словы напісаны з вялікай літары? Чаму?

Выпішыце спачатку імёны хлопчыкаў, а пасля — імёны дзяўчынак.

## ГУЛЬНІ

**150.** Развучыце народную гульню «Маша». Перад гульнёй з дапамогай адной з лічылак выберыце «Машу».

Усе дзеці становяцца ў круг. Пасярэдзіне «Маша» з завязанымі вачыма. Дзеці прыгаворваюць:

Маша, ты пацеха наша,
ручкі злажы, на імя ўкажы.

«Маша» хапае каго-небудзь з круга і павінна адгадаць, хто гэта. Калі адгадае, той становіцца «Машай». Гульня паўтараецца.

**151.** Развучыце карагодную гульню «Люстэрка». З дапамогай лічылкі выберыце таго, хто будзе вадзіць.

Дзеці бяруцца за рукі і становяцца ў круг. Адзін вучань — у цэнтры круга. Астатнія ходзяць у карагодзе пад словы настаўніцы:

Роўным кругам
у карагодзе
любім мы, сябры, хадзіць.
Што нам Танечка (Волечка, Мішачка)
пакажа,
тое будзем мы рабіць.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Той, хто знаходзіцца ў цэнтры круга, паказвае які-небудзь рух (пляскае ў далоні, кружыцца і да т. п.). Усе астатнія паўтараюць.

**152.** Гульня «Кот».

Усе дзеці становяцца ў адзін рад, а насупраць стаіць выбраны пры дапамозе лічылкі «кот». Усе скачуць і крычаць:

Тра-та-та, тра-та-та,
не баімся мы ката!

«Кот» робіць выгляд, што не звяртае на іх увагі. Калі дзеці надта разыдуцца, «кот» сам скокне. Усе заміраюць. Хто зварухнецца або засмяецца, пераходзіць да «ката». Гульня працягваецца да таго часу, пакуль усе дзеці не пяройдуць да «ката».

**153.** Правядзіце гульню з мячом «Я ведаю пяць імён...».

Адзін вучань бярэ мяч, падкідвае яго або ўдарае аб зямлю, падлогу і гаворыць, напрыклад, такія словы:

Я ведаю пяць імён дзяўчынак:
Маня — раз,
Таня — два,
Света — тры,
Тома — чатыры,
Люда — пяць.

Варыянты гульні: «Я ведаю пяць імён хлопчыкаў» (называе імёны), «Я ведаю пяць гарадоў» (называе) і г. д.

Калі мяч упадзе, гулец выходзіць з гульні, пачынае другі. Пераможа той, хто давядзе гульню да канца.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**154.** Гульня «Палачка-шукалачка».

З групы дзяцей выберыце з дапамогай лічылкі таго, хто будзе ўсіх шукаць.

Астатнія хаваюцца хто куды. Калі ўсе схаваюцца, шукальнік на ўмоўленым месцы стукае палачкай і голасна гаворыць:

Палачка-шукалачка,
я іду шукаць.
Каго я першага знайду,
таго за палачкай пашлю!

Каго першага знаходзіць, той пасля таго, як усе знойдзены, становіцца шукальнікам.

**155.** Гульня «У мядзведзя на бару».

З удзельнікаў гульні выберыце «мядзведзя».

Мядзведзь ходзіць па сваім лесе, шукае, хто яму робіць шкоду. Дзеці прыходзяць у лес па ягады, грыбы. Яны ходзяць і разам спяваюць песню:

У мядзведзя на бару
грыбы, ягады бяру.
Мядзведзь рычыць,
на нас глядзіць.

«Мядзведзь» выбірае зручны момант, каб кінуцца на дзяцей. Ён бяжыць за дзецьмі, стараецца каго-небудзь злавіць. Хто будзе злоўлены першым, той становіцца «мядзведзем».

**156.** Гульня «Грушка».

З дапамогай лічылкі выберыце «грушку».

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дзеці бяруцца за рукі, утвараючы круг, у сярэдзіне якога становіцца выбраная «грушка». Дзеці ходзяць у карагодзе вакол «грушкі», спяваюць песню, называючы імя таго, хто стаіць у сярэдзіне круга.

Мы пасадзім грушку
ўсе, усе,
няхай наша грушка
расце, расце.

Вырасці ты, грушка,
вось такой вышыні,
распусціся, грушка,
вось такой шырыні!

Расці, расці, грушка,
ды ў добры час.
Патанцуй, Марылька,
паскачы для нас.

А ўжо наша грушка
распусцілася,
а наша Марылька
зажурылася.

А мы тую грушку
ўсе шчыпаць будзем.
Ад нашай Марылькі
ўцякаць будзем.

«Грушка» ў сярэдзіне круга павінна рабіць усё, аб чым спяваецца ў песні, — танцаваць, кружыцца. Пры словах


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

песні «вось такой вышыні», «вось такой шырыні» дзеці паднімаюць рукі ўверх, разводзяць іх у бакі. Калі спяваюць «А мы тую грушку шчыпаць будзем», усе набліжаюцца да «грушкі», каб ушчыпнуць, і хуценька ўцякаюць, а «грушка» ловіць каго-небудзь з дзяцей, ставіць яго на сваё месца ў сярэдзіне круга, і гульня паўтараецца.

**157.** Гульня «Хто ляціць?».

Настаўніца кажа: «Гусі ляцяць?» — і паднімае рукі ўгару, паказваючы, як ляцяць гусі. Дзеці адказваюць: «Ляцяць!» — і таксама паднімаюць рукі.

— Качкі ляцяць?
— Ляцяць!
— Вераб'і ляцяць?
— Ляцяць!
— Самалёт ляціць?
— Ляціць!
— Рыба ляціць?

Захапіўшыся гульнёй, дзеці могуць сказаць: «Ляціць!» Настаўніца іх спыняе і папраўляе. Гульня заканчваецца тады, калі ўвага дзяцей аслабне і яны стануць як папала паднімаць рукі.

## ПЕСНІ. КАЛЫХАНКІ

**158.** Паслухайце народную песню «Саўка ды Грышка».

Саўка ды Грышка ладзілі дуду,
павесяліцца ды прагнаць нуду.
Ду-ду-ду, ду-ду-ду,
ды прагнаць нуду.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Як разышліся музы́кі, гу-га,
згінула гора, згінула туга.
Гу-га-га, гу-га-га,
згінула туга.

Дзядок старэнькі, ёмкі ўзяўшы прут,
кіем на дзверы паказаў ім тут.
Ту-ту-ту, ту-ту-ту,
паказаў ім тут.

Вы сабе дуйце сваё го-ца-ца,
толькі не страшыце малога хлапца.
Го-ца-ца, го-ца-ца,
малога хлапца.

?! Вясёлая ці сумная гэтая песня? Ці спадабалася яна вам? У якім тэмпе, хуткім ці павольным, яна выконваецца?

Прачытайце ці праспявайце першы слупок песні.

**159.** Паслухайце беларускую народную песню «Касіў Ясь канюшыну».
Прачытайце словы гэтай песні.

Касіў Ясь канюшыну,
касіў Ясь канюшыну,
касіў Ясь канюшыну,
паглядаў на дзяўчыну.
А дзяўчына жыта жала,
а дзяўчына жыта жала,
а дзяўчына жыта жала,
ды й на Яся паглядала.

?! Вясёлая ці сумная гэтая песня?
Навучыцеся яе спяваць.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**160.** Разгледзьце фотаздымак.



?! Ці бачылі вы, як танцуюць «Лявоніху»? Калі бачылі, то адкажыце, спадабаўся вам танец або не.
У якое адзенне апрануты дзеці на фотаздымку? Які ў іх настрой? Па чым вы гэта зразумелі?

**161.** Паслухайце верш.

Ой, Лявоніха, Лявоніха мая,
ты такою прыгажуняй не была.
Як збяромся мы ў свята пагуляць,
нам Лявоніхі сваёй не пазнаць.
Ах, Лявоніха, Лявоніха мая,
ты сягоння, нібы ружа, расцвіла!

?! Пра каго гэты верш? З чым параўноўваецца жанчына?
Чаму слова *Лявоніха* напісана з вялікай літары?
Назавіце ў гэтым слове галосныя і зычныя гукі і іх літары.
Які гук абазначае тут літара *я*? Каб даведацца, скажыце першы склад слова працягла: *ля-а-а*.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Колькі складоў у слове *Лявоніха*? На які склад падае націск? Які знак прыпынку стаіць у канцы апошняга сказа? Якія пачуцці ён дапамагае выказаць?

Спішыце апошні сказ у радок.

*збяромся, свята, сягоння, расцвіла*

**162.** Паслухайце песню «Лявоніха». Навучыцеся спяваць яе першы слупок.

**163.** Паслухайце яшчэ адну народную песню.

### Купалінка

Купалінка-купалінка, цёмная ночка,
цёмная ночка, а дзе ж твая дочка,
цёмная ночка, а дзе ж твая дочка.

Мая дочка ў садочку ружу, ружу поліць,
ружу, ружу поліць, белы ручкі коліць,
ружу, ружу поліць, белы ручкі коліць.

Кветачкі рвець, кветачкі рвець,
вяночкі звівае,
вяночкі звівае, слёзкі пралівае,
вяночкі звівае, слёзкі пралівае.

Купалінка-купалінка, цёмная ночка,
цёмная ночка, а дзе ж твая дочка,
цёмная ночка, а дзе ж твая дочка.

?! Якая гэта песня, вясёлая ці сумная? Паразважайце, чаму. Паспрабуйце праспяваць «Купалінку».



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**164.** Паслухайце народную песню.

### Чаму ж мне не пець?

Чаму ж мне не пець,
чаму ж не гудзець?
Калі ў маёй хатачцы
парадак ідзець.

Чаму ж мне не пець,
чаму ж не гудзець?
Павучок на сценцы
кросенцы снуець.

Чаму ж мне не пець,
чаму ж не гудзець?
Мушка на аконцы
ў цымбалы тнець.

Чаму ж мне не пець,
чаму ж не гудзець?
Парсючок пад лаўкаю
бульбачку грызець.

Чаму ж мне не пець,
чаму ж не гудзець?
Пеўнічак на століку
крошачкі дзяўбець.

Чаму ж мне не пець,
чаму ж не гудзець?
Дзіцятка ў калысцы,
як бычок, равець.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



?! Сур’ёзная ці жартоўная гэтая песня?
Ці добры парадак, апісаны ў песні?
Разгледзьце малюнак. Скажыце, каму не месца ў хаце. Што трэба зрабіць, каб у хаце быў парадак?
Навучыцеся спяваць гэтую песню спачатку разам з настаўніцай, а пасля — самі.
Паспаборнічайце: хто лепш праспявае першы слупок песні.

*чаму ж, гудзець, хатачцы*

**165.** Прачытайце сказы.

**Беларускія народныя песні — гэта «Саўка ды Грышка», «Дудка», «Касіў Ясь канюшыну» і многія іншыя.**

**Беларускія народныя танцы — гэта «Крыжачок», «Полька-Янка», «Бульба», «Мікіта», «Лявоніха».**

?! Ці ведаеце вы такія песні і танцы? Якія з названых песень вы чулі? Якія танцы бачылі?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ці ведаеце вы іншыя беларускія песні і танцы? Назавіце іх, калі ведаеце.
З якой літары напісаны ўсе назвы? Звярніце ўвагу, што назвы ўзяты ў двукоссе.

Выпішыце са сказаў назвы песень і танцаў. Пішыце іх з вялікай літары.

**166.** Паслухайце песню.

**Беларуская танцавальная**

Танцавалі мы гапак,
танцавалі рускую.
Паглядзіце зараз, як
скачам беларускую.
Туп, туп, чаравік,
не ляніся!
Туды, сюды, чаравік,
павярніся!
На Палессі стук ды звон —
гэта грае наш Лявон.
З Юрачкам да нас ідзе,
Мікіту з сабой вядзе.
Туп, туп, чаравік,
не ляніся!
Туды, сюды, чаравік,
павярніся!
Усіх сабралі? Ну, давайце,
дружна танцы пачынайце!
Трэба ўсім на свеце знаць,
як мы ўмеем танцаваць.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Туп, туп, чаравік,
не ляніся!
Туды, сюды, чаравік,
павярніся!

*(Элеанора Багуслаўская)*

?! Навучыцеся спяваць гэтую песню і танцаваць пад яе.

Калыха́нка — песня, якую спяваюць, калышучы дзіця, каб яно заснула. *Рус.*: колыбельная.

**167.** Разгледзьце малюнак.



?! Каго вы бачыце на малюнку?
Што робіць маці?
Хто яшчэ слухае калыханку?
А вам спявала маці альбо бабуля калыханку?
Складзіце па малюнку тры сказы. Скажыце ў іх, што робіць маці, дзіця, кот.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Запішыце сказы, якія вы склалі.

**168.** Паслухайце калыханку.

Люлі-люлі-люлі,
пайшоў кот па дулі.
Адмарозіў лапкі,
палез на палаткі.
Сталі лапкі грэцца —
недзе кату дзецца.

Ду́ля — летні сорт ігруш з вялікімі саладкімі пладамі.
Пала́ці, пала́ткі — насціл з дошак для спання паміж печчу і сцяной (на высокім узроўні ад падлогі) у сялянскай хаце.
Столь — верхняе пакрыццё ўнутры дома, процілеглае падлозе. *Рус.*: потолок.

Ці спадабалася вам калыханка ў выкананні настаўніка?
Прачытайце словы калыханкі самі.
Праспявайце калыханку разам з настаўнікам.

*пайшоў, адмарозіў, палез, грэцца, недзе, дзецца*

**169.** Паслухайце калыханку.

Баю-баюшкі-баю,
не лажыся на краю,
прыйдзе шэранькі ваўчок,
схопіць Таньку за бачок,
аднясе ў кусцік
і назад не пусціць.

Ці чулі вы гэтую народную калыханку?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Навучыцеся спяваць яе. Паспаборнічайце: які рад лепш праспявае.

*ваўчок, бачок, кусцік, назад, пусціць*

**170.** Паслухайце верш.

**Мая песня**

Мая песня — ад бабулі,
што спявала над калыскай:
«Ой, люлі-люлі, ой, люлі,
ходзіць вечар шэры блізка.
Спіце, дзеткі, спіце, знічкі,
спяць звяры даўно і птушкі,
зайка спіць, і спіць лісічка,
і мядзведзя сон загушкаў.
Спіце, дзеткі, люлі-люлі,
хай сон мары вашы здзейсніць».
Мая песня — ад бабулі,
з калыханкі даўняй — песня.

*(Анатоль Зэкаў)*

Зні́чка — падаючая зорка.

У чым бачыць вытокі сваёй творчасці паэт?
Прачытайце частку верша, якая з'яўляецца калыханкай.

**171.** Успомніце любую калыханку, якую вы ведаеце. Праспявайце яе. Ці спявалі вам яе маці альбо бабуля ў маленстве?

**172.** Прачытайце калыханку.

Доўгі дзень,
цёплы дзень
адплывае за аблокі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Сіні цень,
сонны цень
адпаўзае ў кут далёкі.

Збеглі зайкі ўсе ў лясы,
змоўклі птушак галасы.
І буслы ў гняздо схавалі
свае доўгія насы.

Баю-бай, баю-бай,
вачаняты закрывай.

*(Генадзь Бураўкін)*

?! Ці знаёмая вам гэта калыханка? Дзе вы яе чулі? Кампазітар Васіль Раінчык на верш Генадзя Бураўкіна напісаў мелодыю. Атрымалася чароўная песня-калыханка. Праспявайце яе разам з настаўнікам.




Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**173.** Прачытайце калыханку.

Ой, на коціка варкота,
а на дзіцятка дрымота.
Будзе коцік варкатаць,
а дзіцятка будзе спаць.

Вывучыце на памяць гэтую народную песню-калыханку. Паспрабуйце яе паспяваць.

**174.** Паслухайце калыханку.

**Калыханка**

Вось з-за хмаркі і туману
месяц у аконца глянуў.
Светлы месяц хоча знаць,
дзеткі спяць альбо не спяць?

Баю, баю, баю, баю,
я пра месячык спяваю...

Чорны кот яшчэ палюе,
чуе, мышка дзесь шуруе.
Чорны коцік хоча знаць,
дзеткі спяць альбо не спяць?

Баю, баю, баю, баю,
я пра коціка спяваю...

Сонны певень скок аднекуль
і як крыкне: ку-ка-рэ-ку.
Ён таксама хоча знаць,
дзеткі спяць альбо не спяць?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Баю, баю, баю, баю,
я пра пеўніка спяваю...

Апусціўся ціха сон,
вочкі ўсім закрые ён.
І яму не трэба знаць,
дзеткі спяць альбо не спяць.

Баю, баю, баю, баю,
ты ўжо спіш, а я спяваю.

*(Уладзімір Мацвеенка)*

?! Хто і што «дапамагалі» ў калыханцы закалыхваць дзіця? Як выконваюцца ўсе калыханкі: гучна, хутка ці спакойна, павольна, ціхенька? Чаму?

**175.** Праспявайце вечарам, перад сном, адну з калыханак сваім бацькам, бабулі або дзядулю, малодшай сястрычцы ці брацiку.
Потым раскажыце, ці спадабалася ім, як вы спяваеце.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# Святы ў нашым жыцці. Новы год

**176.** Разгледзьце малюнак.



?! Да якога свята рыхтуюцца дзеці? Што яны робяць?
Чым дзеці ўпрыгожваюць клас?
Якія твары ў дзяцей: радасныя ці сумныя?
Ці можна па тварах дзяцей зразумець, які ў іх настрой?
Як вы думаеце, ці чакаюць дзеці Новы год? Чаму вы так думаеце?
А вы чакаеце гэтае свята? Чаму вы яго чакаеце?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**177.** Паслухайце верш.

## Ёлка

Вырасла яліна ў лесе,
стройная, высокая.
А сягоння Дзед Мароз
гэту ёлку нам прынёс.

Тут і воўк, і мядзведзь
паварочваецца ледзь,
тут і зайка касавокі
неадступна пры лісе.

А як кот пайшоў у скокі —
аж у ладкі білі ўсе:
— Вось дык лоўкасць у ката —
проста глянуць любата!



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

А на ёлцы — цацак, цацак!
Ззяюць іскры інею,
і шары на ёй зіхцяць
белыя і сінія.

*(Ніл Гілевіч)*

?! Хто прынёс дзецям ёлку?
Хто такі Дзед Мароз? З кім ён прыходзіць на свята?
У што звычайна апрануты Дзед Мароз і Снягурачка?
Як апранаюцца дзеці на навагодняе свята? Раскажыце пра гэта па малюнку.
Хто такія воўк, ліса, мядзведзь, зайка, аб якіх гаворыцца ў вершы?
Прачытайце верш спачатку самі сабе, а пасля ўслых ланцужком — па два радкі кожны.
Вывучыце на памяць свае радкі. Раскажыце верш ланцужком на навагоднім свяце.

*сягоння, Дзед Мароз, мядзведзь, ледзь, неадступна, аж, ладкі, лоўкасць, ззяюць*

**178.** Прачытайце словы.

*ёлка, яліна, лес, Дзед Мароз, воўк,*
*мядзведзь, зайка, ліса, кот,*
*цацкі, іскры, іней, шары*

?! На якія пытанні адказваюць гэтыя словы?
Што яны абазначаюць: назву прадметаў, жывых істот ці, можа, прыметы прадметаў, дзеянні?
Спішыце словы ў сшытак паводле ўзору.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**У мове вылучаецца група слоў, якія абазначаюць н а з в ы п р а д м е т а ў (рэчаў, людзей, жывёл, раслін, з'яў прыроды, стану чалавека і г. д.). Гэтыя словы адказваюць на пытанні х т о? ці ш т о?**

**179.** Упрыгожце свой клас, спальні так, як гэта зрабілі дзеці на малюнку (старонка 114).

Якія прадметы вам для гэтага спатрэбяцца? Назавіце іх па-беларуску.

Пастаўце ў класе яловыя галінкі, развесьце залаты і сярэбраны дожджык, папяровыя гірлянды, на вокны наклейце сняжынкі.

Раскажыце, што вы рабілі.

**180.** Паслухайце і адгадайце загадкі.

Заўсёды, летам і зімой,
мае́ іголачкі са мной.
Галінак у мяне багата,
зімой прыходжу к вам на свята.

*(Васіль Жуковіч)*

Які год доўжыцца адзін дзень?
Што ў першы дзень года пачынаецца, а ў апошні канчаецца?

На якія пытанні адказваюць словы-адгадкі? Што яны абазначаюць?

Запішыце гэтыя словы ў сшытак паводле ўзору.

*Новы год, каляндар, ёлка*

**181.** Адкажыце на пытанні. Старайцеся гаварыць толькі па-беларуску.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Што прывозяць у школу напярэдадні навагодняга свята?
Дзе ставяць ёлку?
Хто ўпрыгожвае ёлку ў вашай школе?
Чым яе ўпрыгожваюць?
Якія касцюмы рыхтуюць да свята дзеці?
Якую песню вы вывучылі?
Ці вывучылі вы вершы?
Ці ўмееце вы хадзіць карагодам?

?! Запішыце адказ на першае пытанне на дошцы і ў сшытках.

**182.** Паслухайце тэкст.

Новы год людзі стараюцца сустрэць дома. Гэта сямейнае свята. Яго адзначаюць за навагоднім сталом. Навагодні стол павінен адрозніваецца не колькасцю прыгатаваных страў, а прыгажосцю яго афармлення.

Як жа прыгожа аформіць стол? Заслаць белы адпрасаваны абрус. Аднак на Новы год дарэчы і яркі каляровы абрус: жоўты, аранжавы, сіні. Паставіць самы прыгожы посуд, які ў вас ёсць. Запаліць свечку ў прыгожым падсвечніку. Абавязкова павінны быць і сурвэткі, лепш за ўсё льняныя, накрухмаленыя і з выдумкай складзеныя.

А б р у́ с — кавалак тканіны спецыяльнага вырабу, якім засцілаюць стол; настольнік. *Рус.*: скатерть.

Д а р э́ ч ы — у час; у падыходзячы момант; да месца. *Рус.*: уместно, к месту.

С т р а́ в а — пэўным чынам прыгатаваныя для яды прадукты харчавання, ежа.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Як афармляюць навагодні стол?
Знайдзіце ў тэксце словы, якія абазначаюць назвы прадметаў.
Пастаўце да кожнага з іх пытанне *хто?* або *што?*
Запішыце словы разам з пытаннямі паводле ўзору.

*Узор. (што?) год, (хто?) людзі.*

**183.** Адкажыце на наступныя пытанні.

Праз колькі дзён пачынаецца Новы год?
Дзе вы будзеце яго сустракаць?
Колькі дзён засталося да навагодняга свята ў школе?
Якім па ліку будзе наступны год?

Запішыце адказ на другое пытанне.

**184.** Паслухайце верш.

## Дзіўны, дзіўны Дзед Мароз!

I. Надышоў зімовы вечар...
Дык чаму ж не спіць малеча?
Свецяць вокны, ззяюць ёлкі,
і ў Алеся, і ў Міколкі,
і ў Марыны, і ў Аксаны,
і ў Валерыка таксама.

Пэўна, гэта нездарма?
Можа, скажаш ты, зіма?
А зіма ў адказ смяецца!
Хутка ж Новы год пачнецца!
Сёння ўночы, сёння ўночы
ён па ўсёй Зямлі пракрочыць!

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

І ў Алега ёлка ззяе.
Падарункаў ён чакае.
Нешта доўга сёння тата
не вяртаецца дахаты.
Толькі раптам: «Стук-стук-стук!» —
да дзвярэй бяжыць хлапчук.

II. Што такое! Вер ці не —
да Алега, як у сне,
завітаў сам Дзед Мароз.
Валасамі ён зарос.
У руцэ трымае мех.
Кажа ён: — Здароў, Алег!
Я прынёс табе дарункі —
клюшкі, кніжку, пачастункі.
Хоць вусаты, барадаты,
ды падобны ён на тату!
І такі ж высокі рост...
Дзіўны, дзіўны Дзед Мароз!

III. — Адкажы мне, дзіўны дзед,
адрас мой дастаў ты дзе?
— Адрас? — Цётка Завіруха
прагудзела мне на вуха!

— Хто ж табе шапнуў на вушка,
што даўно хачу я клюшку?
— Хто? Вядома, дзядзька Сон,
добра ведаў гэта ён!


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Ну а колькі табе год,
Дзед Мароз? — Ды мо семсот!..
— А чаму ў цябе тады
голас гэткі малады?

— На паветры, на паветры
я гуляю разам з ветрам.
А як стану на канькі —
мне зайздросцяць юнакі!

— Дзіўны, дзіўны, дзіўны дзед.
Што ж ясі ты на абед?
— Ледзяшы, ледзяшы дужа мне па душы,
ды яшчэ сняжынкі, ажно цякуць слінкі!

— Дзіўна! Як жа ты, раз так,
не прастудзішся ніяк?
Засмяяўся Дзед Мароз:
— Дужа ты, сынок, падрос!

*(Павел Марціновіч)*

?! Ці зразумелі вы, хто быў Дзедам Марозам у вершы?

**185.** Паслухайце верш па частках. Адкажыце на пытанні да кожнай часткі.

I. Як завуць дзяцей, што не спяць?
Чаму яны не спяць?
Чаго чакае Алег?

II. Хто завітаў да Алега?
На каго падобны Дзед Мароз?
Якія падарункі прынёс Дзед Мароз Алегу?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

III. Ці спадабаліся вам адказы Дзеда Мароза на пытанні Алега?
Ці паверыў Алег Дзеду Марозу?

**186.** Прачытайце верш самастойна ці паслухайце яго яшчэ раз у чытанні настаўніка.

Навучыцеся чытаць верш выразна.
Прачытайце трэцюю частку па асобах.
Растлумачце напісанне вялікай літары ў словах верша.

*спіць, свецяць, ззяюць, адказ, смяецца, хутка ж, год, сёння, дзвярэй, сне, Дзед Мароз, Алег, кніжку, такі ж, адкажы, хто ж, дзядзька, з ветрам, зайздросцяць, абед, сняжынкі, слінкі, раз так, прастудзішся, засмяяўся*

**187.** Паслухайце верш-пажаданне знакамітага беларускага паэта Кандрата Крапівы.

## З Новым годам

Год за годам — карагодам,
і ўжо сёння з Новым годам
я сардэчна, ад душы
вас віншую, малышы!
А чаго ж я вам жадаю?
Зараз, зараз прыгадаю...
Каб бадзёрымі былі вы,
каб разумнымі раслі,
каб прынёс вам Новы год
многа радасных прыгод
і здароўя ў вашы хаты, —


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

каб былі здаровы самі,
каб былі здаровы мамы,
каб былі здаровы таты,
каб не ведалі напасці,
каб і я за вас быў рад.
З новым годам!
З новым шчасцем!
Вас віншуе дзед Кандрат.

*(Кандрат Крапіва)*

?! Прачытайце пажаданні і запомніце іх.

**188.** Прачытайце верш.

### На зімовых канікулах

Знаёмыя і звыклыя,
срабрыстымі палянкамі
зімовыя канікулы
прыйшлі з канькамі,
з санкамі.
Пад ціхі ход
гадзінніка
званок сніць сны
ружовыя.
А ў шыбы вецер дзінькае:
«Глядзі,
вунь горка новая!»
Ад саначак
за хатаю
сляды, як цені,
сцелюцца.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Імчу з гары пакатае —
і адстае мяцеліца.

*(Мікола Бусько)*

З в ы́ к л ы — які стаў прывычным.

Як праводзіць зімовыя канікулы герой верша? Як збіраецеся правесці зімовыя канікулы вы? Навучыцеся чытаць верш выразна.

*гадзінніка, сніць, сляды, сцелюцца, адстае*

**189.** Прачытайце верш.

**Табе жадаю**

Яшчэ вясна адпачывае,
пад снегам дрэмле крыгаход.
Святло па хвілях прыбывае —
прыйшоў на працу Новы год.

Адкрыў ён звонкае надвор'е,
прасторы — лыжам і канькам,
усё — на добрае здароўе
дзяўчынкам нашым, хлапчукам.

Расці і радуй, дружа мілы,
бацькоў, настаўнікаў, сяброў.
Жадаю розуму і сілы
табе для будучых гадоў!

Любі аддана, шчодра, шчыра
зямлю, дзе прадзеды жылі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Будзь чалавекам дружбы, міру
для ўсіх куткоў, краёў зямлі!..

*(Эдзі Агняцвет)*

Хві́ля — хвіліна.

Чаго жадае вам паэт у новым годзе?
Перакажыце пажаданні аўтара верша сваімі словамі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК

**Абру́с** — кавалак тканіны спецыяльнага вырабу, якім засцілаюць стол; настольнік.

**Айчы́м** — няродны бацька.

**Аксамі́тны** — выраблены з шаўковай тканіны, якая мае мяккі, гладкі і густы ворс.

**Апавяда́нне** — невялікі мастацкі твор.

**Благі́** — дрэнны.

**Ве́расень** — беларуская назва першага асенняга месяца.

**Верш** — невялікі мастацкі твор, напісаны мовай, якая мае рытм і рыфму.

**Ве́чка** — верхняя частка якой-небудзь пасудзіны, скрынкі, каробкі, якою яе закрываюць; накрыўка.

**Вы́рай** — цёплыя краіны, куды адлятаюць на зіму пералётныя птушкі.

**Вясёлка** — шматкаляровая дугападобная паласа на небе, якая ўзнікае ад праламлення сонечных прамянёў у дажджавых кроплях.

**Гарэ́за** — свавольнік, непаседа.

**Го́дны** — *тут*: дастойны, варты чаго-небудзь.

**Дарэ́чы** — у час, у падыходзячы момант, да месца.

**Ду́ля** — летні сорт ігруш з вялікімі салодкімі пладамі.

**За́клічка, закліка́нне** — невялікі вершык з запрашэннем, просьбай прыйсці дожджыку, вясне, выглянуць сонейку і г. д.

**Заро́к** — клятвеннае абяцанне не рабіць чаго-небудзь.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Звы́клы** — які стаў прывычным.

**Зна́кі прыпы́нку** — знакі, якімі пазначаюцца сказы ці іх часткі.

**Зні́чка** — падаючая зорка.

**Ільга́** — можна.

**Ка́зка** — апавядальны твор пра выдуманыя падзеі, пераважна з удзелам чарадзейных фантастычных сіл.

**Калыха́нка** — песня, якую спяваюць, калышучы дзіцяў, каб яно заснула.

**Капялю́ш** — мужчынскі ці жаночы галаўны ўбор.

**Кара́лі** — пацеркі з каралавых або іншых каштоўных камянёў.

**Кастры́чнік** — назва другога асенняга месяца.

**Кашу́ля** — адзенне з лёгкай тканіны на верхнюю частку цела.

**Клі́чнік** — знак прыпынку, які ставіцца ў канцы клічнага сказа.

**Кро́пка** — знак прыпынку, які аддзяляе сказы, а таксама ўжываецца пры скарочаным напісанні слоў.

**Лістапа́д** — назва трэцяга, апошняга асенняга месяца.

**Лічы́лка** — невялікі вершык, з дапамогай якога пералічваюцца, напрыклад, перад пачаткам гульні, каб выбраць вядучага і г. д.

**На́ціск** — вылучэнне (складу, слова) сілай голасу або павышэннем тону, а таксама значок, які паказвае такое вылучэнне.

**Пала́ці, пала́ткі** — насціл з дошак для спання паміж печчу і сцяной (на высокім узроўні ад падлогі) у сялянскай хаце.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Пара́да** — прапанова, як дзейнічаць.

**Па́сынак** — няродны сын для мужа ці жонкі ў сям'і.

**Паце́шка** — невялікі верш, якім забаўляюць дзіця; забаўлянка.

**Паэ́т** — чалавек, які піша вершы.

**Пісьме́ннік** — той, хто піша літаратурныя творы.

**Пры́казка** — кароткае народнае выслоўе павучальнага зместу.

**Пры́маўка** — выраз, пераважна вобразны, які не складае, у адрозненне ад прыказкі, закончанага суджэння.

**Прыпо́л** — ніжні пярэдні край сукенкі, кашулі.

**Пыта́льнік** — знак прыпынку, які ставіцца ў канцы пытальнага сказа.

**Саха́** — сельскагаспадарчая прылада для ворыва.

**Склад** — гук або спалучэнне гукаў, што вымаўляюцца адным штуршком выдыхнутага паветра.

**Скна́ра** — вельмі скупы чалавек.

**Скрозь** — усюды; заўсёды, увесь час.

**Сму́так** — пачуццё суму, маркоты, журбы.

**Столь** — верхняе пакрыццё ўнутры дома.

**Стра́ва** — пэўным чынам прыгатаваныя для яды прадукты харчавання, ежа.

**Страка́тая** — з рознакаляровым апярэннем.

**Страха́** — верхняя покрыўная частка будынка, якая засцерагае яго ад дажджу, снегу.

**Сурвэ́тка** — невялікі кавалак тканіны або паперы, якім засцерагаюць вопратку ад бруду ў час яды і г. д.

**Сюрпры́з** — нечаканасць, нечаканы падарунак.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Турбо́ты** — заклапочанасць чым-небудзь, жаданне ажыццявіць што-небудзь.

**Усухамя́** — усухамятку.

**Халя́ўка** — верхняя частка ботаў.

**Хві́ля** — хвіліна.

**Часо́піс** — перыядычнае выданне ў выглядзе кніжкі, у якой змешчаны артыкулы або мастацкія творы розных аўтараў.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ЗМЕСТ

ПОРЫ ГОДА. ВОСЕНЬ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18

НАША РАДЗІМА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37

БУДЗЕМ ВЕТЛІВЫЯ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49

СВЯТЫ Ў НАШЫМ ЖЫЦЦІ
Дзень нараджэння . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60

ВУСНАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ
Прыказкі і прымаўкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
Пацешкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
Скорагаворкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 83
Загадкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
Заклічкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 92
Лічылкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
Гульні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
Песні. Калыханкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 101

СВЯТЫ Ў НАШЫМ ЖЫЦЦІ
Новы год . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 114

Тлумачальны слоўнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 126

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вучэбнае выданне

**Змушко** Антаніна Міхайлаўна

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

Вучэбны дапаможнік для 5 класа
першага аддзялення дапаможнай школы
з рускай мовай навучання
У дзвюх частках
Частка 1

Адказны за выданне *Т. Ф. Рослік*
Рэдактар *Т. Ф. Рослік*
Дызайн вокладкі *Д. Э. Герасімовіча*
Мастак *А. А. Барташэвіч*
У афармленні вокладкі выкарыстана
рэпрадукцыя карціны «Вясна» *Мікалая Селешчука*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп’ютарная вёрстка *А. Б. Грышына*
Карэктар *А. А. Кастыка*

Падпісана ў друк 31.08.2021. Фармат 70×90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная № 1. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 9,36. Ул.-выд. арк. 4,5. Тыраж 1007 экз. Заказ 144.

Выдавец і паліграфічнае выкананне: рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/159 ад 27.01.2014, № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ